ЗАХОДНЕ-БЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА *ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.*

ПАГОНЯ

№ 37 (93) *11 – 17 лістапада 1994 г.* *Кошт 50 рублёў*

80 працэнтаў прадстаўніц самай старажытнай прафесіі ў Летуве - гэта гастралёры. - ст. 4.

Гэтую сістэму псіхалагічнага аздараўленьня выкарыстоўваюць мільёны людзей. - ст. 6.

Рэцыдывіст сілай завёў у сваю кватэру і спрабаваў згвалтаваць вучаніцу 8-га класа. - ст. 8.

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ НА ТЫДЗЕНЬ: Менск – Варшава – Масква - Санкт-Пецярбург.

Пракурору Гарадзенскай вобласьці спадару Леаніду ЦЯРЭШЧАНКУ.

Начальніку ўправы ўнутраных спраў Гарадзенскага аблвыканкама спадару Анатолю БЕЛАШЭЎСКАМУ.

Старшыні Гарадзенскага выканкама вабласнога Савета дэпутатаў спадару Сямёну ДОМАШУ.

Старшыні Гарадзенскага выканкама гарадзкога Савета дэпутатаў г.Горадні спадару Генрыху КРУПЕНКУ.

ЗАЯВА

1 лістапада 1994 года, напярэдадні дзяржаўнага сьвята "ДНЯ ПАМЯЦІ" - ДЗЯДОЎ, якое спакон вякоў адзначаў увесь люд Беларусі як дзень памёрлых, каля Каложскай царквы быў учынены акт вандалізму над памятным знакам "ПАГОНЯ НА ГРУНВАЛЬД", які быў пастаўлены ў гонар славян (беларусаў, палякаў, ліцьвінаў, рускіх, украінцаў, чэхаў) і малдаван, загінуўшых, але перамогшых нямецкіх крыжакоў 15 ліпеня 1410 года ў бітве пад Грунвальдам.

Варвары ламамі выламалі мемарыяльную дошку з выявай "ПАГОНІ" і скралі яе.

Мы расцэньваем гэты інцыдэнт не як "звычайны крадзёж" каляровых металаў, на што цяпер вельмі модна сьпісваць любыя акты вандалізму такога кшталту. Мы маем падставы сьцьвярджаць, што гэта прадуманая палітычная правакацыя антыдзяржаўных праімперскіх сілаў, якія зараз хочуць правіць баль на Беларусі з маўклівай згоды і абыякавасьці тых, хто мае права і абавязак падтрымліваць парадак у дзяржаве.

Гэта зьнявага беларусаў, палякаў, рускіх, украінцаў, летувісаў, якія жывуць на Гарадзеншчыне. Гэта зьнявага дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, зьнявага над памяцьцю нашых продкаў. Гэта непавага да народа Беларусі. Такія дзеяньні - нішто іншае, як распальваньне міжнацыянальнай варожасьці.

У сувязі з вышэйадзначаным мы заяўляем рашучы пратэст супраць бяздзеяньня пракуратуры, міліцыі і іншых ворганаў улады, якія "не заўважылі" гэтага дзікунства.

Мы патрабуем неадкладнага ўзбуджэньня крымінальнай справы па дадзенаму факту і абавязковага прыцягненьня да адказнасьці тых нелюдзей, якія ўчынілі зьдзек над дзяржаўным сімвалам - ГЕРБАМ ПАГОНЯ, над памяцьцю беларускага народа, яго гістарычнымі і маральнымі каштоўнасьцямі.

Старшыня Гарадзенскай гарадзкой рады, сябра Сойму БНФ "Адраджэньне", Кастусь ЖЫНЬ;

старшыня Саюза палякаў на Беларусі, Тадэвуш ГАВІН;

старшыня Гарадзенскай гарадзкой філіі партыі Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада, Міхась ПАТРЭБА;

старшыня Гарадзенскага гісторыка-культурнага клуба "Паходня", Віктар ВАРАНЕЦ;

старшыня Гарадзенскай гарадзкой рады Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны, прафесар Аляксей ПЯТКЕВІЧ;

старшыня Гарадзенскай абласной рады Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны, прафесар Павел СЬЦЯЦКО;

старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі Беларускага Фонду культуры, прафесар Сяргей ГАБРУСЕВІЧ;

старшыня праўленьня культурна-асьветніцкага фонду "Бацькаўшчына, дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь, Мікола МАРКЕВІЧ;

старшыня Дэмакратычнага аб'яднаньня ветэранаў г.Горадні, Мікола МЕЛЬНІКАЎ.

2 лістапада 1994 года, г.Горадня.



КАСТРЫЧНІК НЕ ДАЕ СПАКОЮ

6-га лістапада прадстаўнікі ПКБ, НРБ, "Очищения" і іншых "левых" арганізацый (асобы, ў большасьці, пеньсіённага ўзросту) правялі на плошчы Леніна ў Горадні мітынг, прысьвечаны гадавіне кастрычніцкага перавароту 1917 года.

Выступы "чырвоных" не адрозьніваліся разнастайнасьцю. Па традыцыі, яны патрабавалі аднаўленьня СССР і вяртаньня дню 7 лістапада статуса дзяржаўнага сьвята, абвінавачвалі "імперыялістаў" і "здраднікаў" у развале Саюза, гаварылі пра жабрацтва жыхароў Беларусі, сумавалі па сацыялізму, заклікалі прысутных падтрымаць прадстаўнікоў "левых" арганізацый на выбарах.

Урэшце, прынялі рэзалюцыю, у якой патрабавалі аднаўленьня СССР. І разышліся.

А.Д.

НАПАЛЕОН БЫЎ БЫ НЕЗАДАВОЛЕНЫ

Напрыканцы кастрычніка ў Віцебску адбыўся гадзінны мітынг, прысьвечаны 182-й гадавіне вызваленьня горада ад напалеонаўскіх войскаў. Ініцыятарам мітынгу быў Славянскі сабор "Белая Русь". Па дадзеным МУС Беларусі, у мітынгу ўзялі ўдзел 47 чалавек, сярод якіх былі і члены Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

«МЕЛАНЖ» ПАД ПЫТАНЬНЕМ

500 тон акісьляльніка расейскага паліва "меланж" забылі на тэрыторыі Віцебскай вобласьці выведзеныя ў Расею ракетныя войскі. Вакол выпадку разгарэўся скандал. Менавіта пад напорам грамадзкасьці "прадукт" было вырашана адправіць сьледам за гаспадарамі, нягледзячы на тое, што Міністэрства абароны Беларусі вельмі жадае збудаваць пад Бараньню прадпрыемства па перапрацоўцы акісьляльніка на азотныя ўгнаеньні.

Дарэчы, абсталяваньне для прадпрыемства без ведама эколагаў ужо завезена.

ДЭФІЦЫТ НАЯЎНАСЬЦІ НЕ ПРАДБАЧЫЦЦА

Як заявіў старшыня праўленьня Нацбанка Беларусі С.Багданкевіч, нядаўна былі завезены з Расеі два вагоны наяўных грошай. Ён таксама паведаміў, што банк заказаў у Дзяржзнаку Расеі на першы квартал наступнага года 6,5 трыльёнаў беларускіх рублёў. Па яго словах, гэта дазволіць поўнасьцю задаволіць патрэбы рэспублікі ў наяўных грошах з улікам лістападаўскага падвышэньня мінімальнай зарплаты і забароны ў студзені на розьнічны гандаль за валюту.

Па словах С.Багданкевіча, у лістападзе ў абарот будуць уведзены 20-тысячныя купюры, а ў студзені - 50- і 100-тысячныя. На банкноце ў 20000 будзе адлюстраваны будынак Нацыянальнага банка.

СІМ.

АСОБЫ ВАНДАЛАЎ УСТАНОЎЛЕНЫ

У мінулым нумары "Пагоня" паведамляла пра акт вандалізму, учынены на старых каталіцкіх могілках Шчучына. Намаганьнямі супрацоўнікаў міліцыі былі ўстаноўлены асобы, якія зьдзейсьнілі гэта. Імі аказаліся навучэнцы СПТВ-98 А.і Ш., абодва 1978 года нараджэньня, і Т., 1979 года нараджэньня (двое - дзеці вайскоўцаў). Узбуджана крымінальная справа па артыкулу 201 частка другая (злоснае хуліганства) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Парушальнікі закона могуць атрымаць на яму ад аднаго да пяці гадоў пазбаўленьня волі.

ІНФЛЯЦЫЯ 10-11 ПРАЦЭНТАЎ - РЭАЛЬНА?

На прэс-канферэнцыі, якая нядаўна адбылася, кіраўнік Нацбанка С.Багданкевіч выказаў задаволенасьць эканамічнай палітыкай новага кіраўніцтва рэспублікі. "Я бачу сёньня, што Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь - гэта не кандыдат у Прэзідэнты. Я спадзяюся, што Лукашэнка канчаткова пераадолее свае перадвыбарчыя пазіцыі. Трэба стварыць эфектыўную эканоміку і на яе аснове ўзьнімаць узровень жыцьця насельніцтва", - сказаў старшыня НББ. Ён таксама заявіў, што 99 працэнтаў ідэй, прапанаваных парламенту, прыняты.

Па словах Багданкевіча, у яго "ёсьць паразуменьне з прэм'ерам". Аднак галоўны банкір таксама заявіў: "Я не задаволены адсутнасьцю у ўрада злосьці. Трэба праводзіць рэформы, не раячыся. Калі мы правядзем іх хутка, то будзе вынік. Калі зацягнем, пойдзем на саступкі, то нічога не атрымаецца". На яго думку, многае будзе залежыць ад кадраў, бо праграм і дагэтуль было шмат. Ён адзначыў, што пакуль праграма неадкладных мер выконваецца. На думку С.Багданкевіча, зьніжэньне ўзроўня інфляцыі да канца года да запланаваных 10-11 працэнтаў у месяц - рэальна.

СІМ.

Запрашаем да сталага супрацоўніцтва рэкламных агентаў, а таксама грамадзкіх распаўсюджвальнікаў.
Зьвяртацца на адрас: г.Горадня, вул.Дамініканская, 1.
Тэл. 45-29-59, 45-41-83.



ТЫ ПАДПІСАЎСЯ НА ГАЗЕТУ «ПАГОНЯ»

Падпіска прымаецца ва усіх паштовых аддзяленьнях.

Падпісны індэкс 63124.
Кошт на месяц - 500 рублёў, на квартал - 1500 рублёў, на паўгодзе - 3000 рублёў.

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ НА ПЕРШЫМ ПЛАНЕ

Як вядома, Беларускі Народны Фронт абавязаўся ўстрымацца ад крытыкі дзеяньняў Прэзідэнта Беларусі ў першыя 100 дзён яго праўленьня.

На сёньняшні дзень гэты тэрмін скончыўся, і дзейнасьць А.Лукашэнкі на пасадзе кіраўніка дзяржавы па прозьбе карэспандэнта СІМ пракаментаваў каардынатар апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце С.Навумчык: "Першыя сто дзён паказалі, што дзеяньні Прэзідэнта аказаліся не такімі неразумнымі і катэгарычнымі, як некаторыя яго заявы, але ж у цэлым яго ўчынкі як кіраўніка дзяржавы такія ж непаслядоўныя, якім непаслядоўным быў у свой час дэпутат Лукашэнка.

Па-першае, Прэзідэнт, на жаль, не пераканаўся ў тым, што Беларусь можа разьлічваць толькі на свае сілы, не чакаючы якойсьці істотнай дапамогі ні з Усхода, ні з Захада. Па-другое, вельмі трывожны сімптом - некаторыя выказваньні Прэзідэнта ў адносінах працэса нацыянальнага адраджэньня - я маю на ўвазе выступ у педагагічным універсітэце. Патрэцяе, непасьлядоўнасьць праяўляецца ў супярэчнай эканамічнай канцэпцыі.

Для нас зараз не такая ўжо істотная крытыка Прэзідэнта, важней падрыхтоўка да парламенцкіх выбараў. І ўся нашая дзейнасьць будзе накіравана на падрыхтоўку да іх, на прыняцьце закона аб выбарах і закона аб сродках масавай інфармацыі, дзе ў нашых папраўках мы зьбіраемся выкарыстаць і заўвагі, выказаныя ў час канферэнцыі, арганізаванай Мас-Медыа-Цэнтрам".

СІМ.

АСТРАВЕЧЧЫНА СТВАРАЕ СУПОЛКІ БНФ

5-6 лістапада адбыліся сустрэчы народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь З.Пазьняка, В.Голубева, Л.Баршчэўскага і Ю.Беленькага з насельніцтвам Астравецкага раёна. Вядома, што Астравеччына на прэзідэнцкіх выбарах была на першым месцы па колькасьці галасоў, адданых за кандыдата ад БНФ "Адраджэньне" З.Пазьняка. Сустрэчы адбыліся ў васьмі населеных пунктах і ахапілі амаль увесь раён. Дэпутаты езьдзілі двума камандамі. Першую склалі З.Пазьняк і В.Голубеў, другую - Ю.Беленькі і Л.Баршчэўскі. Яны дзякавалі людзям за тое, што аддалі свае галасы за З.Пазьняка, расказвалі людзям, чаму склалася такое становішча ў краіне, калі да ўлады прыходзіць чалавек, што не мае сваёй кампетэнтнай каманды і дакладнай, навукова абаснаванай праграмы. Выхад са становішча бачыцца толькі ў абраньні новых, вучоных і кампетэнтных людзей да парламенту дзяржавы падчас будучых выбараў. Дэпутатаў вельмі добразычліва сустракалі, задавалі шмат пытаньняў. Карацей, бачна, што людзі задумваюцца аб сваім лёсе.

А вось у вёсцы Палушы мясцовы старшыня В.Балабановіч, нягледзячы на рашэньне райвыканкаму, аднесся да гасьцей не вельмі гасцінна. Ён загадаў не адчыняць клуба, а сам схаваўся. Людзі каля гадзіны чакалі каля зачыненых дзьвярэй, потым знайшлі загадчыцу клуба, якая была павінна зрабіць усё, каб сустрэчы не было. Але сустрэча адбылася. Напрыканцы сустрэчы Балабановіч зьявіўся з пагрозамі да загадчыцы. Пагражаў, што даб'ецца звальненьня яе з працы. Пасьля пагроз ў клубе дэпутаты нанесьлі візіт старшыні мясцовага калгаса і запатрабавалі тлумачэньня супрацьпраўных дзеяньняў.

У заключэньні, 13 чалавек запісаліся ў шэрагі Беларускага Народнага Фронту, правялі сход, склалі пратакол і ўтварылі суполку БНФ.

Дарэчы, па ўсіх населеных пунктах, дзе адбываліся сустрэчы (Палушы, Гервяты, Варняны, Кямелішкі, Альхоўка, Падольца, Міхалішкі), створаны суполкі, да якіх уваходзяць амаль 100 чалавек.

М.БАЎСЮК,
Старшыня Гарадзенскай вабласной рады БНФ "Адраджэньне".

АД ПУБЛІКАЦЫІ ДА КАМІСІІ АДЗІН КРОК

8-га лістапада на ранішнім паседжаньні парламента 208 дэпутатаў прагаласавалі за ўключэньне ў парадак дня пытаньня аб стварэньні камісіі па расьследаваньню абставінаў, зьвязаных з публікацыяй у "Известиях" артыкула А.Старыкевіча "Приём на высшем уровне получали в Беларуси главари мафии". Парламентарыі выказалі таксама жаданьне заслухаць інфармацыю дэпутата С.Антончыка аб карупцыі ў каманьдзе Прэзідэнта.

НРБ МАЕ НАМЕР ІНІЦЫІРАВАЦЬ РЭФЕРЭНДУМ

Як паведаміў старшыня адміністрацыі НРБ С.Гайдукевіч, народны рух Беларусі не мае ніякага дачыненьня да спробы ініцыіраваць рэферэндум аб дэнансацыі белавежскіх пагадненьняў, наданьня рускай мове статуса дзяржаўнай, перагляд дзяржаўнай сімволікі і адмене прыватнай уласнасьці на сродкі вытворчасьці, якую зрабіла ў кастрычніку група грамадзян пад кіраўніцтвам нейкай Паўловіч. Па яго словах, НРБ зьбіраецца пасьля 10 лістапада выступіць з уласнай ініцыятывай аб правядзеньні рэферэндума. Магчыма, на яго будзе вынесена пытаньне аб дзяржаўным ладзе Беларусі.

Лідэр Народнага руху заявіў таксама, што НРБ не прымаў ніякага ўдзелу ў сьвяткаваньні 7-га лістапада (Па яго словах, "у нас с коммунистами нет ничего общего, кроме идеи восстановления экономических связей"), што на камуністычных мітынгах зьбіраюцца людзі, якія прапагандуюць старыя ідэі і ўводзяць народ у зман.

УРАЧЫСТАСЬЦІ КАМУНІСТАЎ ПОСЬПЕХА НЕ МЕЛІ

6-га лістапада ў Менску па ініцыятыве ПКБ і ДСПС быў праведзены мітынг, прысьвечаны гадавіне падзей 1917 года, У ім прыняло ўдзел каля 5 тысяч чалавек. Аналагічныя мерапрыемствы прайшлі яшчэ ў 14 гарадах Беларусі, дзе камуністы здолелі сабраць пад свае сьцягі ў суме каля 3400 чалавек.

«ВЯЧЭРНІ МІНСК» ПРАЙГРАЕ

У Савецкім раённым судзе Менска завяршылася судовае разьбіральніцтва па іску сьледчага сталічнай пракуратуры А.Варапаева да газеты "Вячэрні Мінск". На думку Варапаева, надрукаваная 30 сакавіка газетай інфармацыя прэсслужбы Ўпраўленьня ўнутраных спраў Менскага гарвыканкаму кампраментуе яго імя.

Суд задаволіў чатыры з пяці пунктаў іску і абавязаў адказчыкаў даць абвяржэньне і выплаціць у якасьці кампенсацыі за маральны ўрон два мільёны рублёў.

СТУДЭНТАМ ВЫНЕСЬЛІ ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ

Ленінскім раённым судом Менска разгледжана адміністрацыйная справа ў адносінах студэнтаў БДУ, якія 14-га кастрычніка ўзялі ўдзел у дэманстрацыі перад Домам ураду.

Судзьдзя Л.Жаўнерчык вынесла студэнтам А.Міхалёву і В.Цемушаву папярэджаньне.

Свабодны прафсаюз студэнтаў рыхтуе чарговую акцыю пратэсту, якая плануецца адбыцца 17-га лістапада.

Дарэчы, украінскія студэнты падтрымліваюць захады беларускіх. У Кіеве каля 30 сяброў украінскай студэнцкай арганізацыі "Студэнтська профспілка" пікетавалі беларускае пасольства. Студэнты перадалі зварот да беларускага ўраду, у якім выказваюць сваю нязгоду з прасьледаваньнямі сваіх беларускіх сяброў.

СІМ

БПС - СУЦЭЛЬНАЯ АПАЗІЦЫЯ

Беларуская партыя Свабоды толькі зьбіраецца быць зарэгістраванай, а хто-ніхто ўжо далучае яе да "Шэрых ваўкоў", "Правага рэваншу" і іншых падобных арганізацый. Але БПС - гэта ўласная філасофія, што не мае нічога агульнага ні з адной з "ультраправых" партый.

Дык калі аднойчы вас назвалі вярблюдам, вельмі цяжка даказаць адваротнае. Скандал, што ўзьнік падчас канцэрту "Рок на вакацыях" літаральна на пустым месцы, неўзабаве вырашыцца гучнай судовай справай. Распавядае старшыня БПС Сяржук ВЫСОЦКІ:

- Мне было вельмі прыемна ўбачыць сярод гледачоў сьцяг нашай партыі, і я вырашыў падысьці да тых, хто прыйшоў з ім на канцэрт. Але раптам невядома адкуль зьявіліся "амонаўцы", пачалі штурхаць нашых хлопцаў. Сьцяг апынуўся ў мяне... І хоць нам абяцалі, што ўсё будзе ў межах закону, скончылася гэта звычайнай бойкай і абразамі ў наш адрас. Мяне суткі пратрымалі ў міліцыі, але, у рэшце рэшт, адпусьцілі, завёўшы судовую справу, якую ўжо два разы павінны былі разглядаць, ды па розных прычынах адкладвалі, вырашыўшы разабрацца трэцім разам. Але я ўпэўнены ў сваёй невінаватасьці і праваце і зьбіраюся рашуча змагацца за правы беларусаў.

- А пачалося ўсё, быццам, са сьцяга, што спалучае ў сабе тры колеры: белы, чырвоны і чорны...

Чорны колер - гэта своеасаблівае адлюстраваньне сёньняшняга стану беларускага народа, ягонай шматпакутнай гісторыі, той боль, смутак і нігілізм, што пануюць у душах нашых грамадзян. Чырвоны - барацьба за вызваленьне Бацькаўшчыны, што вялася і працягвае весьціся. Белы - сьветлая надзея на будучыню... Калі ж прасьцей, гэта спалучэньне беларускага нацыянальнага сцяга са сьцягамі партый кансерватыўнага накірунку ў Заходняй Эўропе. Накшталт Аўстрыйскай партыі Свабоды, Нямецкай рэспубліканскай партыі, правых кансерватараў у Брытаніі...

- Заяўляючы пра сябе, вы абавязкова падкрэсьліваеце свой моцны нацыяналізм. Але, згадзіцеся, крайнасьці заўсёды перашкаджалі любой справе.

- Наш нацыяналізм - нацыяналізм у эўрапейскім разуменьні. У сэнсе высокай адданасьці Бацькаўшчыне. Да таго ж, у абавязковым спалучэньні з інтэлектам. Таму я не магу лічыць яго за крайнасьць. Было б вельмі груба прадстаўляць нас як зацыкленых нацыяналістаў. Калі на тое пайшло, мы - хутчэй прагматыкі. Але калі палітык-прагматык на карысьць сваёй дзяржаве, хто папракне яго ў гэтым? Такім чынам, мы супраць таго, каб Беларусь пазбаўлялася ядзернай зброі. У будучыні яна стане надзейным гарантам ад магчымай замежнай інтэрвенцыі. Да гэтага мы ні капейчыны не атрымалі ні ад Расеі, ні ад Захаду, што вінныя нам за разузбраеньне. А літаральна днямі я дачуўся пра жудасную навіну - дзеці ў нашых дзіцячых дамах церпяць ад голаду... Неабходна правесьці перамовы з Расеяй і наконт нашай экалогіі - напэўна ж, чулі такі тэрмін, як "выпаленыя землі". Калі ЗША за ваенныя базы заплацілі Філіпінам два з паловай мільярды долараў, мы ізноў нічога не атрымалі ад ранейшага "старэйшага брата", хаця "братавых" базаў у нас намнога больш. Калі мы ўжо карыстаемся расейскімі нафтай і газам адпаведна амаль міжнародных коштаў, то гэтак жа маем права спаганяць з Масквы за знаходжаньне ў нас чужынскіх базаў. Надзвычай мяккая палітыка вядзе толькі да непавагі, дзе-ндзе нас ужо называюць "агурковымі грамадзянамі"...

- Дык што, настала "зорная гадзіна" для правых?

- Палітыка БНФ гэтак жа церпіць крах, як і палітыка афіцыйных уладаў, апусьціўшыся да згодніцтва і кампрамісаў. У "фронтаўцаў" зараз добра вызначыліся дзьве плыні людзей. На адным баку апынуліся Пазьняк, Хадыка, Баршчэўскі, Навумчык і з імі сотні сумленных радавых прыхільнікаў Фронту. А на другім - так званая люмпенска-бюракратычная структура, што любым чынам імкнецца пралезьці ў парламент. Не дарэмна ў Эўропе такую папулярнасьць набіраюць правыя партыі. Насьпеў час іхняга рэнесансу. Па нашых меркаваньнях, Беларусь будзе арыентавацца на тых правых, якія ў пераважнай большасьці супраць сучаснага аб'яднаньня Эўропы. Зараз час высокага ўзрастаньня нацыянальнай самапавагі народаў. Сапраўднае аб'яднаньне з усходнеўэрапейскімі краінамі магчыма хіба што ў далёкай перспектыве - Беларусь бачыцца нам у хаўрусе з Нямеччынай, Славакіяй і Харватыяй.

Першая з гэтых краін мае перад намі вялізную маральную запазычанасьць, а Харватыя і Славакія вельмі падобныя на Беларусь сваім сёньняшнім станам.

- Але якія падставы вы маеце для таго, каб сьцьвярджаць, што гэтыя дзяржавы будуць згодныя на падобны хаўрус?

- Усім ім мы маглі б гарантаваць ядзерную бясьпеку, спадзяючыся паразумецца праз тамтэйшых правых, пэўныя сувязі з якімі ў нас ужо ёсьць. Заходнія партыі, кшталту нашай, літаральна штодня робяцца мацнейшымі (варта прыгадаць вынікі апошніх выбараў у Бельгіі і Аўстрыі). Час і нам нешта вырашаць з нашай "агурковай дзяржавай", якой мы зрабіліся за дзесяцігоддзі нацыянальнага прыніжэньня - выніку расейскага царска-камуністычнага генацыду. Ды і людзі, відавочна, не зьбіраюцца надалей мірыцца са сваёй "агурковасьцю", што і паказалі апошнія выбары. Галасавалі за таго, хто абяцаў бескампрамісна змагацца з негатыўнымі вынікамі ранейшай палітыкі. Высьветлілася, што і малады ўзрост лічыцца ў народа хутчэй за вартасьць, чым за недахоп. Таму мы разьлічваем на вельмі моцную падтрымку. Па-першае, за Беларусь гатовыя "зубамі змагацца", па-другое, узрост большасьці нашых людзей - да трыццаці гадоў. У асноўным гэта выпускнікі БДУ і педагагічнага інстытута, бізнесмены "сярэдняй рукі" і рабочыя.

- Ці ёсьць у вас свая эканамічная праграма?

- Безумоўна. І даволі ладная. Напачатку мы зьбіраліся ў значнай ступені зьмяніць падаткавую палітыку, калі ўрад проста вымушае прадпрымальнікаў да крыміналу. Нацыянальную культуру і спорт, напрыклад, наогул вызвалілі б ад падаткаў. Выступаем мы таксама і за парытэт прыватнай уласнасьці, якая павінна быць недатыкальнай. Ва ўнутранай палітыцы бачым сябе ў рэчышчы "тэтчырызму". будзем прапаноўваць рабочым і бізнесменам заключаць індывідуальныя кантракты. Прафсаюзы з цягам часу павінны зьнікнуць наогул, бо зьявіўся даволі багаты клас прафсаюзных босаў, што жывуць за конт працоўных. Гэтак жа катэгарычна выступаем супраць розных ільготаў і пеньсій, бо працоўныя людзі і самі ільготнікі, вымушаны ўтрая плаціць за хлеб, каб бясплатна езьдзіць у транспарце...

Супрацоўніцтва з Расеяй таксама павінна быць выведзена на новы ўзровень. Нам патрэбны нацыянальны бізнес, і мы, безумоўна, пойдзем насустрач тым расейскім бізнесменам, што будуць шчыра імкнуцца супрацоўнічаць з намі, не прэтэндуючы зрабіцца панамі на нашай зямлі... Тут наогул патрэбна прагматычная, але тонкая палітыка. Ужо зараз неабходна ўсталёўваць сувязі з рэгіёнамі. Дзяржава мусіць усяляк падтрымліваць дзейнасьць беларускіх прадпрымальнікаў, скіраваную на асваеньне сыравінных рэсурсаў Расеі. Перспектыва быць у ролі "стартавай пляцоўкі" для Захаду ў распрацоўцы абшараў усходняга суседа - даволі рэальная і можа прынесьці вялікую карысьць. Што ж датычыцца расейскай мафіі, пранікненьне на Беларусь заганнага крымінальнага сьвету павінна быць спынена ўсталяваньнем сапраўдных межаў. Сур'ёзнасьць гэтай праблемы падкрэсьліваюць нядаўнія забойствы беларускіх прадпрымальнікаў заезжымі кілерамі...

- Безумоўна так, але гэтая тэма вартая асобнай размовы, яна надзвычай складаная... А яшчэ б хацелася даведацца пра вашае стаўленьне да шматлікіх нацыянальных сьвятаў, якім апошнім часам надаецца ўсё большая ўвага з боку самых розных палітычных сіл...

- Яшчэ адна памылка БНФ - гэта рамантычнае сьвяткаваньне разнастайных угодкаў даўніны. Губляць столькі грошай напярэдадні выбараў проста недаравальна. Падобнымі гістарычнымі гадавінамі павінны займацца патрыятычна-вайсковагістарычныя клубы. Такія ўсенародныя сьвяты, як 8 верасьня, альбо Грунвальдзкая бітва, варта праводзіць па ўзору сьвяткаваньня ў Эўропе. Гэтак жа, як у Расеі, напрыклад, адзначаюцца ўгодкі Барадзінскай бітвы. Нават можна было б запрасіць тых жа расейцаў разам адсьвяткаваць 8 верасьня.

А пакуль за шумам сьвятаў расейскі капітал спакойна скупляе беларускую маёмасьць, мы можам проста не заўважыць, як апынемся нявольнікамі на сваёй зямлі.

Гутарыла Ірына ЗАВАДЗКАЯ.



ЛІСТЫ

У лістах, а іх штотыдзень прыходзіць да рэдакцыі па некалькі, аўтары дзеляцца сваімі ўражаньнямі, выказваюць думкі, узьдымаюць набалелыя праблемы.

Па магчымасьці "Пагоня" зьмяшчае на сваіх старонках матэрыялы чытачоў. На жаль, не ўсе яны зьмястоўныя, таму і надрукаваць іх не ўяўляецца магчымым. Заранёў перапрашаем тых, хто пісаў і недачакаўся прачытаць у газеце свой артыкул. І ўсёткі без вашых інфармацый і парад "Пагоні" не быць. Пішыце нам пра цікавыя падзеі, што адбыліся ў вашым мястэчку, горадзе, вёсцы. Мы заўжды будзем рады.

Ніжэй друкуюцца найбольш надзённыя, на думку рэдакцыі, лісты.

СПАЧУВАЕМ І ПАДТРЫМЛІВАЕМ

Прачытала ў вашай газеце аб крывавых падзеях, якія адбыліся ў Горадні 5 кастрычніка, калі азвярэлы рускамоўны натоўп у чарговы раз заявіў аб сваёй агрэсіўнасьці, насільлі да беларускіх сьвятыняў, да нашай гісторыі, культуры, да ўсёй нацыі.

Прышэльцы ўсіх адценьняў пралілі кроў прафесара медінстытута А.Астроўскага, паднялі брудныя рукі на сумленных беларусаў, што вышлі бараніць нашу тысячагадовую гісторыю ад зьнявагі агрэсіўных захопнікаў.

Мы з сынам прыносім сардэчнае спачуваньне і ўдзячнасьць усім удзельнікам фронтаўскага пікета, а таксама падтрымку ў вашых патрыятычных дзеяньнях за незалежную Беларусь, за адраджэньне беларускай нацыі!

Мы выказваем рашучы гнеў і асуджэньне нашчадкам злачыннай КПБ-КПСС за зьнявагу, абразу беларускай зямлі, нашай гісторыі, беларускай нацыі! Захопнікам усіх адценьняў няма месца на Беларускай зямлі!

Дэпутаты гарвыканкама Горадні павінны выконваць свае прамыя абавязкі па вяртаньні гораду свайго гістарычнага аблічча.

У Гарадзенскім педінстытуце (цяпер універсітэт) я атрымоўвала вышэйшую адукацыю, хадзіла па вуліцах Савецкай, Розы Люксембург, плошчы Леніна і іншых інтэрнацыянальных пракамуністычных. І толькі вуліца Ажэшкі будзіла цёплыя нацыянальныя пачуцьці. Родную мову ведалі з інстытута, але ўсе прадметы чыталі нам на рускай мове.

Але, слава Богу, Беларусь заявіла аб сваёй незалежнасьці, суверэнітэту. І мы павінны скінуць з сябе хамут імперскіх насільнікаў, вярнуць сваю спадчыну, нацыянальны дух.

Вуліцам, плошчам, назвам нашых гарадоў, вёсак, у тым ліку і Горадні, неабходна вярнуць свае нацыянальныя, гістарычныя імёны. Гэта воля беларускага народа, а дэпутаты павінны выконваць менавіта волю нацыі, карэннага насельніцтва. Час камуністаў прайшоў. Усе войны на Беларусі пылалі з-за імперскай, агрэсіўнай палітыкі Расеі, якая імкнулася трымаць усе народы ў каланіяльнай залежнасьці. Таму, той крыкун, які прыпісаў сабе ролю "вызваліцеля" Горадні ў 44-ым годзе, і яму падобныя, павінны ведаць нашую гісторыю, выконваць волю беларускага народа, а не прадаўжаць далей ролю гвалтаўніка на беларускай зямлі.

Вось чаму Беларусі цяпер неабходны свае Каліноўскія. У гэтым жа нумары зьмешчаны артыкул "Мы, правыя нацыянал-рэваншысты..." - інтэрв'ю з кіраўніком Беларускай Нацыяналістычнай Арганізацыі "Правы Рэванш" Славамірам Адамовічам. Усе пункты праграмы Славаміра Адамовіча падтрымліваем, пагаджаемся. Жадаем яму ў яго сьвятых памкненьнях для Бацькаўшчыны моцнага здароўя, посьпехаў. Мы, беларусы, хто перажывае душой за нашу свабоду, заўсёды разам з нашымі патрыётамі.

Цяпер, калі на Беларусі, каб аднавіць зноў імперыю зла на беларускай зямлі, паднімаюць галовы нашчадкі злачыннай КПСС, расейскія шавіністы, беларускай нацыі неабходна яднацца вакол патрыятычных партый, такіх, якой зьяўляецца БНА "Правы Рэванш", каб адстойваць сваю незалежнасьць.

Беларусы павінны праявіць рашучасьць, цьвёрдасьць, каб жыць дастойна, як і належыць беларусам, выйсьці з тупіка, у якім мы аказаліся па віне акупацыі ўсходняга суседа. Хочацца закончыць свой ліст словамі Славаміра Адамовіча: "Мы патрабуем дысцыпліны і беларускага парадку. Мы патрабуем прыняцьця закону, які ўзяў бы пад ахову сьвяшчэнныя правы Беларускай Нацыі на самаразьвіцьцё на этнічнай тэрыторыі". Гэта патрабаваньне ўсяго беларускага народа, беларускай нацыі.

З вялікай павагай да ўсіх змагароў за Бацькаўшчыну!

Н.Х.КАЛЯДА,
настаўніца.

«Я Б ХАЦЕЎ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ...»

Чытаю вашу газету на працягу амаль году і заўсёды быў згодны з публікацыямі, якія друкаваліся ў газеце.

Але калі я прачытаў 34 (90) нумар "Пагоні", то ўзьніклі пытаньні, але ўжо не да вас, шаноўная рэдакцыя, а да сп.А.Мальдзіса і Валдаса Банайціса (наконт "Рыма-5 у Троках" і "Глухому не скажаш, сьляпому не пакажаш...").

Дык вось, па-першае, мяне вельмі ўразіў адказ прафесара А.Мальдзіса наконт спадчыны. З першым я згодзен, што "чыста беларуская група - гэта перш за ўсё Скарына, Будны, Цяпінскі і інш..."

Але вось я не згодны наконт супольнай спадчыны. Сп.Мальдзіс гаворыць: "Статуты паўставалі, як вядома, ў патрыятычным летувіскім асяроддзі, але напісаныя старабеларускай мовай..."

Калі так, дык атрымліваецца, што Сапегі, Тышкевічы, Радзівілы - гэта "патрыятычнае летувіскае асяроддзе"? Ды й увогуле навошта пісаць на беларускай мове, можа лепш на летувіскай? І яшчэ, пры дварох тых "летувіскіх" магнатаў у XV-XVI ст.ст. панавала беларушчына. Так атрымліваецца, што Сапегі, Радзівілы - былі (па А.Мальдзісу) "летувісамі-патрыётамі". Тады адкуль пры дварох гэтых магнатаў зьявілась беларушчына, навошта яны фундавалі розныя манастыры, друкарні (Радзівілы, Будны) ды шмат чаго рабілі на беларускай ніве?

Але самае галоўнае, чаму яшчэ дасюль не было знойдзена ніводнага статуту па летувіскай мове, Адказ просты: ці гэта памылка друку, ці проста А.Мальдзіс пераблытаў два падобныя і адначасова розныя паняцьці Літва (у сэнсе - Беларусь) і Летува (якая ў той час называлася Жамудзьзю). І яшчэ было б неабходна, каб трымаць поўны адказ на пытаньні, спытаць сп.Мальдзіса, што ён меў на ўвазе, гаворачы пра "літоўскае патрыятычнае асяроддзе".

Думаю, што рэдакцыя будзе згодна са мною, што не было ніякіх "патрыятычных летувіскіх асяроддзяў" сярод складальнікаў статутаў ВКЛ, не гаворачы ўжо пра этнічныя беларускія землі, якія былі ядром ВКЛ, калі не браць Украіны, дык на ўсе 90 працэнтаў беларускай дзяржавай было ВКЛ.

Я бы хацеў прыняць удзел у парадку дыскусіі наконт словаў: ЛЕТУВА, ЛЕТУВІС і ім падобных.

Канешне, усе ведаюць, што летувіс - гэта штучны наватвор, але патрэбны нам, каб не рабіць памылак у паняцьцях ВКЛ, Літва, ліцьвіны (але, на жаль, гэтыя памылкі ўсё роўна робяцца).

Дык вось, я ня згодны з аўтарам артыкулу, таму што гэтыя паняцьці "ужываліся" ужо на пачатку стагоддзя (асабліва ў эміграцыйных колах). І, думаю, ЛЕТУВІС у нас ужо прыжыўся і няма сэнсу зьмяняць на ЛЕТУВЕЦ і ЛЕТУВАНІН, якія, на мой погляд, гучаць не лепш ЛЕТУВІСА, ды й увогуле ЛЕТУВЕЦ і ЛЕТУВАНІН - гэта спроба зьблізіць паняцьці ЛІЦЬВІН, ЛІТОВЕЦ, ЛЕТУВІС. І калі б я вырашаў лёс гэтых назоваў, то заставіў бы ЛЕТУВІС, а ЛЕТУВЕЦ І ЛЕТУВАНІН адбросіў бы, як непадыходзячыя пад нашу мову.

Навошта крушыць традыцыі? Я вельмі паважаю імкненьне пісаць (вашай рэдакцыі) тарашкевіцай, але граматычныя памылкі не надаюць вашай газеце павагі.

І яшчэ. Той жа ліст В.Банайціса не тарашкевіцай надрукаваны, а чаму?

А так, пад канец, я б пажадаў вам посьпехаў на беларускай ніве, у справе адраджэньня памяці, самасьвядомасьці і мовы ў беларускага народа.

Жыве Беларусь!

Віктар МУХІН,
вучань 8 "Г" гімназіі N 1
г.Менска, 13 год.

ЯНЫ МРОЯЦЬ МІНУЎШЧЫНАЙ

Добры дзень, паважаная рэдакцыя. Я працую ў АН Беларусі, кіраўніцтва якой бярэ сабе грошы, што ідуць з Нямеччыны дзеля падтрымкі навукоўцаў і навуковых праграм. Больш таго, яны не нясуць аніякай адказнасьці, цынічна кажучы, што ніякіх сродкаў не паступае. Такія адносіны - гэта непавага да навукоўцаў. Паглядзіце ў вочы тых, хто працуе пад кіраўніцтвам гэтай наменклатуры. Гэта забітыя духоўна, абыякавыя, глухія людзі.

Таму тут, у акадэміі, з лёгкасьцю гавораць ману немцам, амерыканцам. Маняць, што менавіта ўсё добра, а самі з абліччам жывёлы выпрошваюць марку ці долар у іншаземцаў.

На жаль, яны пасланыя на зямлю сьвятую-Літоўскую камуністычна-калгаснай сістэмай, ня маюць ні сваёй думкі, ні сваіх, дзяржаўных падыходаў на разьвіцьцё нашай беларускай навукі. Наадварот, іхнія падыходы такія, што з беларускай alma-mater адыходзяць вядучыя навуковыя кадры. А ім хоць бы што, абы б іх пасады заставаліся і ніхто з маладых і таленавітых навукоўцаў не пажадаў заняць іх цёплае месца. Я адзінаццаць з паловай год змагаюся з гэтай бездухоўнай, бяздарнай глыбай. Іх не прымае Эўропа, і яны сядзяць тут, як цэрберы, сьцерагуць свае месцы. Яны ў большасьці супраць рэформаў, бо рэформы - гэта іх вораг. Яны спадзяюцца, што тыя часы, калі ім за псеўданавуку даваліся прэміі і ўзнагароды, вернуцца і наноў запануюць навокал камуністычныя ідэі. Для гэтай ідэі яны і трымаюцца, топячы з ганьбай усё людзкае, усё прагрэсіўнае.

Ул.САНДРЫГАЙЛА,
ст.навуковы супрацоўнік
АН Беларусі.

ЗГОДНА ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ ТРАДЫЦЫІ

Днямі, на старых польскіх могілках Горадні адбылося перазахаваньне рэшткаў жаўнераў Войска Польскага. Пахаваньне, якое адбылося больш за 55 гадоў таму, было знойдзена ў 1991 годзе падчас раскопак катлавана пад будаўніцтва. Камісія, якая была створана пры кастрычніцкім райвыканкаме высьветліла, што ў невядомай магіле пахавана болей за 90 жаўнераў. Таксама камісія вызначыла, што сярод пахаваных былі як каталікі, так і праваслаўныя. Па сабраных аповядах старажылаў узьнікла некалькі версіяў гісторыі іх гібелі. Найбольш праўдападобна гучала версія аб тым, што жаўнераў Войска Польскага, якія вялі абарону на поўдзень ад Горадні, аблажыўшы з усіх бакоў, пасеклі кавалерысты Чырвонай Арміі.

Больш як тры гады рэшткі праляжалі ў скляпеньнях Бернардынскага касьцёла горада. Увесь гэты час з боку каталіцкай дыяспары Гарадзеншчыны рабіліся захады да ўладаў правесьці перазахаваньне рэшткаў жаўнераў згодна хрысьціянскай традыцыі. Найбольш высілкаў у гэтым накірунку зьдзейсьніў актывіст Саюзу Палякаў Беларусі Рышард Кацынель. Дзякуючы яго намаганьням і было атрымана дазваленьне на перазахаваньне.

Перазахаваньне адбылося ў дзень дзяржаўнага сьвята Беларусі "Дзяды". Яно распачалося сьвятой імшой па загінуўшых у Бернардынскім касьцёле Горадні. Затым урачыстасьці перанесьліся на вайсковыя могілкі, дзе яшчэ адно набажэнства адслужыў біскуп гарадзенскай каталіцкай дыяцэзіі Аляксандр Кашкевіч. Затым, адпаведна з хрысьціянскімі традыцыямі, труны, упрыгожаныя дзяржаўнымі штандарамі Беларусі і Польшчы, былі перададзены зямлі на польскіх могілках. На пахаваньне загінуўшых жаўнераў войска польскага прыйшло некалькі тысяч гарадзенцаў. Чынны ўдзел у жалобных мерапрыемствах узялі сябры Гарадзенскай рады БНФ "Адраджэньне", гісторыка-культурнага клуба "Паходня", Грамадзка-палітычнага аб'яднаньня імя К.Каліноўскага.

З прамовай у гонар палеглых выступілі пасол Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь Э.Смулек, прадстаўнік польскага ўраду А.Пшэвзнік, ад Саюза Палякаў Беларусі - намесьнік Старшыні праўленьня Р. Кацынель.

Прысутнічаў на жалобных урачыстасьцях консул Рэспублікі Польшча ў Горадні Мар'януш Машкевіч.

Г.АСТРОЎСКІ.
Фатаграфаваў А.УЛАДАСЕВІЧ.







СУМЕЖЖА

ВЕСТКІ З ПОЛЬШЧЫ

З першага студзеня 1995 года ў Польшчы адбудзецца дэнамінацыя злотых. Купюры вартасьцю ў 10000 злотых будуць роўныя адной злотоўцы.

Польскія банкі болей не прымаюць злотыя старога ўзору вартасьцю 50, 100 і 500 тысяч, а таксама купюры ў адзін і два мільёны. Зьнятыя з карыстаньня банкноты замянілі новыя купюры той жа вартасьці.

На новых грошах побач з лічбамі чорнага колеру ёсьць чырвоная бліскучая нітка. Менавіта так польскі нацыянальны банк хоча забясьпечыць нацыянальныя грошы ад падробак.

* * *

Гарадзкая рада Кракава большасьцю галасоў прыняла пастанову аб забароне расьпіцця моцных напояў у цэнтральнай частцы горада. Забарона таксама тычыцца торжышчаў, паркаў, сквераў. Парушальніка пастановы чакаюць тры месяцы турмы ці вялікі штраф.

* * *

Прэм'ер Польшчы Вальдэмар Паўляк адпраўляецца з рабочым візітам да Вялікабрытаніі. Мэта візіту - абмеркаваньне варыянтаў уступленьня Польшчы да Вуніі Эўрапейскай і НАТА.

* * *

З сёмага лістапада ў Польшчы на 5% павялічыліся цэны на лекі ў дзяржаўных аптэках і шпіталях.

* * *

У Гдыні распачаўся 50-ты фестываль кіно. Свае стужкі на фестывалі прадэманструюць кінарэжысёры больш як з 30 краін.

* * *

Папа Ян Павел II падчас высьвячэньня касьцёлаў у горадзе Сіракузы заклікаў вернікаў да барацьбы супраць наркамафіі.

* * *

У Брыгідзкім касьцёле Гданьска адбылася сьвятая імша, прысьвечаная 76-годзю незалежнасьці Польшчы. Набажэнства - гэта толькі пачатак шырокамаштабнай акцыі, распачатай польскім касьцёлам у гонар незалежнай і вольнай Польшчы.

* * *

Партыя зялёных Польшчы распачала акцыю па ўратаваньню самых старых гатункаў дрэў Белавежскай пушчы. Акцыя будзе бязтэрміновай і пройдзе па ўсёй тэрыторыі краіны.

Таксама зялёныя патрабуюць забароны высяканьня якіх-кольвечы парод дрэў на тэрыторыі пушчы, бо гэта, на іх думку, прывядзе да дысбалансу флоры і фаўны гэтага рэлікавага лесу.

* * *

Вучні, настаўнікі ды выпускнікі Агульнаадукацыйнага беларускамоўнага ліцэя імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску Падляскім адсьвяткавалі 50-годдзе свайго "альма-матэр".

Ва ўрачыстасьцях удзельнічала вялікая група афіцыйных асобаў як ад Польшчы, так і ад Беларусі.

Яго Блажэнства мітрапаліт Васілій перадаў на рукі дырэктара ліцэя Ордэн Марыі Магдалены 1-ай ступені.

Урачысты малебен у гонар юбілею адслужыў яго Прэасьвяшчэнства архіепіскап Сава.

* * *

У Гданьску адбыўся XV зьезд гісторыкаў Польшчы. Ён прайшоў пад назвам "Вялікая і малая айчына". У яго працы ўзялі ўдзел гісторыкі з Беларусі, Летувы, ЗША.

* * *

Саюз Украінскай Моладзі Незалежнай і Фундацыя разьвіцця культуры "Кантакт" супольна з беларускім таварыствам культуры "Хатка" зарганізавалі на Беласточчыне II фестываль нацыянальных меншасьцяў.

У фестывалі ўзялі чынны ўдзел самадзейныя тэатры СУМН "Кантакт" і ад БТК "Брама", а таксама эстрадны калектыў "Белы сон" з Кракава.

«ГЛЫБОКАЯ ЭКАЛОГІЯ» НЕ СЬПІЦЬ

Нядаўна сябры польскай грамадзкай арганізацыі "Глыбокая экалогія" правялі акцыю пад назвай "Выратуем пушчу".

Акцыя распачалася з невялікага фэсту абрадаў і заклікаў на тэрыторыі Белавежскай пушчы. Затым удзельнікі акцыі пераехалі да Варшавы, дзе на працягу некалькіх дзён і начэй пікетавалі Сейм. Падчас пікетаваньня сябры "Глыбокай экалогіі" давалі канцэрты, праграму якіх склалі экалагічныя песьні. У заключэньне на імя Прэзідэнта Рэспублікі Польшча Леха Валенсы быў напісаны зварот у абарону флоры і фаўны Белавежскай пушчы.

Акцыя ў абарону элітарнага лесу Эўропы шырока асьвятлялася замежнымі тэлерадыёкампаніямі, акрэдытаванымі ў Польшчы.

І.АРЦУКЕВІЧ.

ВІЛЕНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Урад Летувы прадставіў на ратыфікацыю Сейма пагадненьне з Украінай аб супрацоўніцтве ў вобласьці пенсіённага забесьпячэньня, падпісанае ў Вільні 27 верасьня бягучага года. Яно прадугледжвае ўрэгуляваньне пенсіённага забесьпячэньня асоб, якія стала пражываюць на тэрыторыі адной з дзяржаў і перасяляюцца на жыхарства ў іншую дзяржаву.

У 1990-1993 гадах з Украіны ў Летуву прыехалі 3850 пенсіянераў, а на Украіну з Летувы выехалі 11.846 чалавек.

* * *

У Клайпедзе прадстаўнікі Фонда ўзаемапаразуменьня і згоды пры ўрадзе Расеі пачалі выплату кампенсацый былым вязьням фашысцкіх канцлагераў. Ужо зарэгістравана больш за 130 чалавек, якія маюць права прэтэндаваць на яе атрыманьне.

Памер кампенсацыі - ад 800 да 1500 нямецкіх марак. У расейскі фонд перададзена 400 мільёнаў марак. З гэтай сумы атрымаюць кампенсацыі таксама жыхары Летувы і Латвіі. Жыхары Эстоніі атрымаюць іх з беларускага фонда.

* * *

За няпоўныя дзесяць месяцаў бягучага года ў Летуве зафіксавана 464 забойствы і замахі на забойства. Гэта амаль на 20 працэнтаў больш, чым за гэты перыяд мінулага года. Гэтыя лічбы супярэчаць сцьвярджэньням высокапастаўленых дзяржаўных службовых асобаў, што крымінагенная сітуацыя ў краіне быццам бы стабілізіравалася.

* * *

"Палітычныя амбіцыі бяруць верх над лагічна неабходнымі для абодвух бакоў рашэньнямі", - так пракаменціраваў стан летувіска-расейскіх адносін прэзідэнт Асацыяцыі гандлёва-прамысловай палаты Летувы М.Чарняўскас. Ён разам з 80 кіраўнікамі летувіскіх прадпрыемстваў, банкірамі, прадстаўнікамі дзяржаўных інстытутаў і членамі Сейма знаходзіўся ў Маскве, дзе быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве з гандлёва-прамысловай палатай Расеі.

* * *

Яшчэ ў чэрвені праўленьне Сейма прыняло пастанову, у якой парламентарыям рэкамендавалася не перавышаць ліміт міжнародных перамоваў - 80 літаў штомесяц.

Нядаўна праверены тэлефонныя рахункі. Высьветлілася, што камітэты, асобныя парламентарыі на працягу траўня-ліпеня ўстаноўлены ліміт значна перавысілі.

Першым у сьпісе значыцца лідэр правай апазіцыі В.Ландзбергіс, які нагаварыў на 1299 літаў 62 цэнта і адправіў факсаў на 3211 літаў 29 цэнтаў.

* * *

За дзевяць месяцаў бягучага года ў Летуве зарэгістравана 254 злачынствы, зьвязаныя з наркотыкамі, што на 30,3 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд летась. Амаль у чатыры разы павялічылася колькасьць групавых злачынстваў. Кожнае шостае зьдзейсьнена ў стане наркатычнага ап'яненьня. Удвая большая колькасьць людзей прыцягнута да крымінальнай адказнасьці - 190 чалавек. Кожнае адзінаццатае злачынства ўчыняе іншаземец.

ЛР

БУДЫНАК КОНСУЛЬСТВА ПРАЕКТУЕЦЦА Ў ВАРШАВЕ

Праектна-сьметная дакументацыя на ўзьвядзеньне будынка пад консульства Рэспублікі Польшчы ў Горадні будзе выканана ў адным з архітэктурных інстытутаў Варшавы. Будаўнічыя матэрыялы, абсталяваньне, мэбля і сантэхніка таксама будуць замоўлены польскім бокам за мяжой.

Вядома, што на ўдзел у конкурсе, каб здабыць права на набыццё акцыі на будаўніцтва консульства, ужо прэтэндуюць каля дзесятка польскіх і летувіскіх фірмаў.

Г.Н.

ШУКАЙЦЕ ШЧАСЬЦЯ САМАСТОЙНА

Газета "Пагоня" пісала, што для працы ў Беласточчыні ваяводстве Польшчы патрабуюцца лекары-стаматолагі, педыятры, гінеколагі. Для вырашэньня пытаньня польскі бок зьвярнуўся да Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь з прапановай накіраваць на працу да гмінных шпіталяў Беласточчыны лекараў вышэйзгаданых прафесій. (Як вядома, на Беларусі існуе чарга на атрыманьне працоўнага месца для старэйшага медыцынскага персаналу).

На жаль, дайсьці да паразуменьня бакі не змаглі, і добрая справа захлынулася. Аднак газеце "Пагоня", якая правяла расьследаваньне пытаньня, стала вядома, што нашы лекары могуць самастойна зьвярнуцца да Ваяводзкага бюро працы Беластока з запытам аб атрыманьні ліцэнзіі на прафесійную дзейнасьць.

Г.ДАМІНІКАНСКІ.

ДЫСКУСІІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА, А ФІРМЫ НАДАЛЕЙ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ

"Самая старажытная прафесія не мае ў Летуве глыбокіх каранёў, - сказаў міністр унутраных спраў Вайцякунас у адказ на запыт аднаго з членаў Сойму наконт некантраляванай дзейнасьці фірм тыпу "Эсмеральда" (падобныя фірмы прапануюць прыемнае правядзеньне часу з дзяўчатамі - Ул.С.). Дэпутат у запыце да міністраў унутраных спраў, юстыцыі і фінансаў хацеў высьветліць, на якой падставе выдаецца дазвол на дзейнасьць падобных фірм, якім чынам праводзіцца кантроль і спагнаньне падаткаў, чаму прэса так інтэнсіўна рэкламуе гэтую дзейнасьць, колькі праведзена праверак і якія іх вынікі.

Міністр унутраных спраў паведаміў, што законы Летувы не прадугледжваюць непасрэднай адказнасьці за прастытуцыю. А адміністрацыйныя санкцыі папросту сьмешныя: за прастытуцыю штраф у першы раз складае ад 3 да 10 літаў (0,5-2,5 долара), у другі раз на працягу года - ад 10 да 30 літаў. Міністр пагаджаецца, што сумы гэтыя сьмешныя, і пагэтаму падрыхтаваны праект, паводле якога штраф можна будзе павялічыць да 1000 літаў.

Паводле яго слоў, 80 працэнтаў прадстаўніц самай старажытнай прафесіі ў Летуве - гэта гастралёры. Прыгажуні ж з Летувы шукаюць шчасьця на рынках іншых краін, пераважна ў арабскіх дзяржавах.

Акрамя таго, міністр падкрэсьліў, што яго ведамства мае таксама і свае інтарэсы, а менавіта інтэграваньне праз падобныя фірмы ў злачынныя арганізацыі.

"Мы не рэгіструем фірмы, не кантралюем іх дзейнасьць і ўвогуле не маем ані якіх правоў і абавязкаў, зьвязаных з такімі фірмамі",- сказаў міністр юстыцыі.

Міністр фінансаў, у сваю чаргу, гаварыў, што ягонае ведамства наглядае за правільнасьцю разьлікаў гаспадарчага суб'екта з дзяржавай. А працякае ён дастаткова правільна і своечасова. "Не сказаў бы,- падкрэсьліў міністр, - што даходы ўтойваюцца".

Паводле слоў намесьніка старшыні Сойму Бічкаўскаса, найбольшае зло заключаецца ў тым, што вядомыя для ўсіх фірмы нікога і нічога не баяцца, адкрыта рэкламуюць сябе і сваю дзейнасьць - прастытуцыю. Вядзе гэта да пашырэньня прававога нігілізму, сказаў ён.

Уладзіслаў СТРУМІЛА.

НОВЫ ПРЫБОР - НОВЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ?

Альгімантас Маліцкас і Рыціс Грыгалюнас - фізікі. Пасьля заканчэньня Віленскага ўніверсітэта Рыціс арганізаваў фірму "Эксвер" і пачаў "рабіць" грошы, Альгімантас жа заняўся камп'ютэрным аналізам адбіткаў пальцаў у сваім акцыянерным таварыстве "Неўратэхналогія".

Зарабіўшы грошы, яны "кінулі" іх у навуку. Затрымаліся на ідэі стварэньня прыбора, які б ідэнтыфікаваў чалавека па радужнай абалонцы вока.

І вось маладыя вучоныя скончылі працу над сваім прыборам. Ён складаецца з мініяцюрнай відэакамеры, якая перадае дадзеныя пра вока ў камп'ютэр, а той ловіць сотню спецыфічных прыкметаў, апрацоўвае іх і апазнае чалавека. Магчымасьць памылкі - 0,00001 працэнта.

Яны мяркуюць, што ў будучыні прыбор заменіць крэдытныя карткі, коды, іншыя метады ідэнтыфікацыі чалавека ў стандартных сістэмах бясьпекі.

Распрацоўкай зацікавіліся ўжо аддзелы аховы Летувіскага акцыянерна-інвестыцыйнага банка і банка "Літімпэкс". Спецыялісты мяркуюць, што прыбор знойдзе сваё прымяненьне пры абслугоўваньні кліентаў, на манетных дварах, іншых спецыфічных гаспадарчых аб'ектах Міністэрства ўнутраных спраў.

Такі сродак можна было б выкарыстоўваць у індывідуальных сейфах, якія знаходзяцца ў банках. Ёсьць, аднак, і пэўны фактар рызыкі: забіўшы чалавека і выкарыстаўшы ягонае вока, можна прабрацца ў сейф. Грыгалюнас запэўніў, што пасьля ўдасканаленьня прыбор адрозьніць жывое вока ад мёртвага.

Кіраўнік аддзела працэсаў апазнаньня Інстытута матэматыкі і інфарматыкі прафесар Цяльксніс зазначае, што навуковыя дасьледаваньні ў галіне методыкі апазнаньня праводзяцца ў Летуве, аднак фінансуюцца яны слаба, і таму многія таленавітыя навукоўцы выязджаюць за мяжу.

Уладзіслаў СТРУМІЛА.



СЛУЦКАЯ КАЛЬВІНСКАЯ ГІМНАЗІЯ (сярэдзіна XIX ст.).



СЛУЦКІ САБОР (1941г.).



ЛЯСЫ, БУНКЕРЫ, ПАРТЫЗАНЫ

(Заканчэньне. Пачатак у N 36. Друкуецца на мове арыгінала).

Вітушка, сын вучыцеля й былы афіцэр Чырвонае Арміі,* прыняў мяне ў аднэй скромнай "Вільлі" ў прыгожым месцы. Прывёў мяне да яго ад'ютант. Сам Вітушка сядзеў за пісьмовым сталом, як дырэктар нейкага прадпрыемства, бязь ніякіх таямніцаў, якімі звычайна ўпрыгожваюць іншых партызанаў за зялезнай заслонай. Прывітаўшыся, ён сказаў:

- Я вельмі рады, што вы трапілі да нас. Назначаем вас кур'ерам і сувязным. Думаю, што на нуду ня будзе часу. Ён кіўнуў галавою і я мог ісьці.

Вось гэта быў Вітушка, за галаву якога Саветы вызначылі вялізарныя прэміі. Адвага, з якой вёў ён свае справы, імпанавала мне.

Шэф меў слушнасьць, цьвердзячы, што на брак працы наракаць ня буду. Гэта было праўдай.

Будучы кур'ерам, я змог глыбей заглянуць у жыцьцё г.зв. "нялегальных" і быў змушаны зьмяніць, дый даволі грунтоўна, мае даўнейшыя погляды.

Самая думка, што партызаны сядзяць у тайных закутках і ў вельмі цяжкіх абставінах, аказалася зусім хвальшывую. Толькі тыя, якія шукала палітычная паліцыя ці якіх чакала служба ў Чырвонай Арміі, хаваліся ў лясох і балотах. Іншыя ж, як мірныя жыхары, займаліся працай, некаторыя мелі нават вядучыя становішчы.

Гэтая сытуацыя нават і сёньня не зьмянілася. Бальшыня партызанаў вядзе двайное жыцьцё. Раз на год яны праходзяць вайсковую навуку. Бяруць водпускі ў сваіх установах, або пішуцца хворымі, каб выкраіць сабе тыдзень ці два й пазнаёміцца з новай зброяй, выбуховымі матар'ямі, спосабамі камунікацыі.

У добра замаскаваных лягерох, якія знаходзіліся галоўным чынам сярод непраходных балот, была сабраная вялізарная колькасьць зброі, амуніцыі, запасных частак, вопраткі й харчоў. Цэлая акруга была моцна замінаваная. Папаўнялася гэта нападамі на дзяржаўныя крамы, амуніцыйныя склады Чырвонай Арміі й нападамі на цягнікі.

Адна часьць забясьпечаньня - перадусім мадэрная радыёстанцыя была закупленая за межамі і ў засакрэчаным вагоне перапраўленая праз межы. Маё першае спатканьне з "партызанамі", якія забясьпечвалі транспарты й кантрабанду, было апісана раней.

УДАВАНЫЯ НАПАДЫ

Вартаўнікам лягераў амуніцыі рэгулярна плаціў "Нацыянальна-Вызвольны Камітэт". Роўна плацілі жаўнерам і афіцэрам і яны час ад часу атрымлівалі урлёп**, зразумела із хвальшывымі дакумантамі. Аплата была даволі высокая, таму і "партызанам часовым" (рэзэрвістам) выплачвалася выраўнаньне зарплаты.

Мясцовыя жыхары памагалі нелегальным па сваіх сілах. Наложаную савецкімі "вызвольнікамі" норму выпаўніць было немагчыма ды пры гэтым трэба дапамагчы яшчэ партызанам. Таму людзі кідаліся на розныя "хітрыкі". Да такіх належаў удаваны напад. Сябры "Чорнага Ката" куплялі нейкую колькасьць збожжа па рэгулярных цэнах, а ночы арганізавалі напад, падчас якога забіралі раней заплачанае збожжа. У гэтым выпадку грамада не патрабавала здаваць на ссыпку й гэтым збывала з сябе падазрэньне ў сабатажы.

НАВЕДВАЮЦЬ ЗЕМЛЯКІ

На працягу колькіх тыдняў займаўся я радыёслужбай. Мадэрны апарат стаяў у маім скромным пакоі. Сюды вечарам заглядалі да мяне землякі. Часткова былі гэта афіцэры былой нямецкай арміі, якія нейкім сьляпым прыпадкам, або гульнёй лёсу папалі ў шэрагі партызанаў. Некаторыя з іх вайной страцілі жонак і дзяцей, іншыя зноў таму, што Бацькаўшчына іх трапіла пад польскую акупацыю, а некаторыя былі шукальнікамі прыгодаў ды проста мелі нахіл да барацьбы; гэта быў асаблівы род "ляндкнэхтаў", якія думалі, што маральна мусяць дапамагаць у барацьбе з бальшавізмам.

Аднаго вечару мы сядзелі й разважалі тэорыі й прынцыпы партызанскага змаганьня: эльбінгскі марак, зьнішчальнік якога недзе ў Балтыцкім моры наскочыў на міну, далей танкіст з Сілезіі ну й я. Пачалося з таго, што я выказаў сумлевы ў посьпехі партызанскіх змаганьняў, а Сілезец запратэставаў. - Ты выходзіш з хвальшывае пазыцыі - казаў ён. - Мы дзейнічаем ня сілай, адно толькі фактам, што мы ёсьць. На нашым баку ініцыятыва, рухлівасьць і неспадзеўка. Гэта ўсё ад нас залежыць. Кажнае разьвідленьне, кажны лясок, кажны роў, усё можна выкарыстаць на засадку. Шансы партызанскага змаганьня ляжаць не ў мілітарным, а толькі ў маральным спосабе. Мы можам паўгоду сядзець ціха, але саветы мусяць быць заўсёды напагатове таму, што мы дзесьці пакажамся. Натуральна, у вадкрытым полі мы ня зможам абараніцца, але гэта мажлівасьць змушае саветы быць заўсёды напагатове. Яны думаюць, што калі ні сёньня дык заўтра мы зможам пайсьці на іх гарматамі ці танкамі.

Ён разгарачыўся ў сваіх высновах, кажучы: - Я маю сваю тэорыю трох: лясы, воды, пустыры. Гэта тры фактары, у якіх наша вайна мае надзею на перамогу.

- Лясы й пустыры, з гэтым згаджаюся, - сказаў я, - але пры чым тут воды? Мне здаецца, што ты крыху задалёка заскочыў.

АД АРМІНА ДА ЛЯЎРЭНСА

Марак заківаў галавою, кажучы: - Гэта праўда, што падводная лодка розьніцца ад партызанскай. Яна змушае частку караблёў пад сільнай аховай рухацца групай, згодна з правіламі сыстэмы канвою, даглядаць тыя адзінкі, што ня маюць вялікае хуткасьці й прытарнавацца да агулу таму, што падводныя лодкі нападаюць тады, калі яны змогуць. Гэта малая вайна знаходзіцца ў межах магчымасьці. Ён закурыў. Тэорыя трох ня ёсьць узятай з паветра, а гэта клясычны прыклад, пустынная тактыка палкоўніка Ляўрэнса з першай сусьветнай вайны. Арганізаваўшы арабскае паўстаньне, ён тымсамым падрыхтаваў мадэрную партызанскую тактыку. Наапошку Армінус, гэрманскі князь, які разьбіў Вару са ў Тэўтабурскім лесе, гэтак залажыў першыя паняцьці пра партызанскую вайну.

Я зірнуў на гадзіньнік, уключыў прыёмнік на адбор і чакаў. Праз некалькі хвілін потым застукалі тры пары мужскіх ботаў па сьцежцы ў даліну. - Што такое? - спытаў Сілезец. - Пачакай, - адказаў я, - не заўсёды трэба быць цікавым.

Спаць ня было часу.

З прыцёмнымі ліхтарамі ківаўся у цёмнай ночы грузавік. Восем "нялегальных" з суседніх калгасаў ускочылі да нас і разьмясьціліся на вузкіх лаўках. Відаць, паведамілі іх раней. Выглядала, што шофэр добра ведаў дарогу, бо ні разу не затрымаўся. Спыніліся на адной паляне. Чалавек з перавешаным на плячо аўтаматам адчыніў заднюю кляпу.

- Хутчэй! - сказаў. - Шэф ужо чакае.

ЖЫВЁЛА З МЭКЛЕНБУРГУ Ў КРЫМ

Ён вёў нас вузкай лясной сьцежкай. Было так цёмна, што ледзь відаць быў чалавек, што йшоў перад табой. Лаючыся, за мной ішоў Сілезец. Яму галіна стукнула па твары. Пакрысе вочы прызвычаіліся да цемры. Вось на паляне стаяла група мужчын. Мы замальдаваліся каманьдзеру. Ён быў вельмі малады й думаю, што я яго колькі тыдняў назад бачыў як ад'ютанта Вітушкі.

- Слухайце, - сказаў ён, - частка з вас яшчэ ня ведае ў чым справа. У працягу ночы мы чакаем на савецкі транспарт, што мае даставіць быдла з Мэкленбургу ў Крым. Ён ужо авізаваны яшчэ ўчора. Некалькі групаў ляжаць ужо напагатове пару дзён. Мы сьцягнулі падмацаваньне, каб як найхутчэй справіцца з абозам быдла. Цягнік мае быць тут за дзьве гадзіны. Груповыя пакажуць, што каму рабіць. Гэта было б усё.

Людзі, не гаворачы ні слова, пачалі разыходзіцца. Мяне прыдзялілі да групы, што мела заданьне ахоўваць чыгунку. Мы мусілі прапусьціць цягнік, каб потым унемажлівіць савецкай ахове ўцёкі.

ВУХА НА РЭЙЦЫ

Мы заляглі на сваіх пазыцыях, калі вярнуўся да нас Сілезец, кажучы: - Я агледзеў месца падрыву, ну... калі гэта ні ўзьляціць!

Чакалі. Час ад часу пазіраў я на гадзіньнік і мінуты валакліся вельмі паволі. Пачало сьвітаць. Ужо можна было разгледзіць абапал чыгункі дрэвы. Я падняў каўнер плашча й падыйшоў да каляі, каб прылажыць вуха да рэйкі, але нічога ня было чуваць. Калі я вярнуўся, дык Сілезец запытаўся: - Нэрвуешся? Альбо, мусіць, раней зашмат раманоў Карла Маркса чытаў?

Раптам пачулі мы голас: - Падрыхтавацца!

Зірнуўшы ўздоўж шляху, пабачылі воддаль сьвятло, што пранізвала ранькою імглу, пачулі грукат колаў, можна было б падумаць, што цягнік затрымаўся, гэтак паволі ён набліжаўся. Вось ужо добра відаць яго ліхтары і ён прасоп каля нас. Раўнамерна стукалі па рэйках колы, мы яшчэ больш прыляглі да зямлі...але нічога не было. Раптам грымнуў узрыў, крыкі і, як мне здалося, грукат кулямёту МТ 42. Тады мы ўскочылі й разлучыліся направа й налева ад шляху. Налева ад нас пачулі тры невялікія ўзрывы. Ручныя гранаты. Двух чалавек у савецкіх мундзірах беглі па шляху ў нашым кірунку. Калі нашы кулі засьвісталі ім ля вушэй, яны завярнулі й вялікімі крокамі падаліся да цягніка.

Перад намі яшчэ стралялі, але нашая група змоўкла й запанавала ціша, толькі перапалоханая жывёла раўла ў вагонах. Мы йшлі ўздоўж палатна, ахоўваючы абодва бакі. Нашая асьцярожнасьць была лішняй. Калі падыйшлі да цягніка, групы мужчын адчынялі вагоны й выладоўвалі жывёлу.

У ПАЛОН НЕ БЯРУЦЬ

Маладая дзяўчына ў высокіх ботах, расшпіленым плашчы й цёмназялёнай спартовай кашулі перавязала раненаму партызану руку. Тонкі касмыль валасоў упаў ёй на твар і энэргічным кіўком галавы яна адкінула яго назад.

- Ці маеш ты перавязачную пачку? - спытала мяне.

Я даў ёй, што патрабавала й бель бінта зазьзяла на пакрытай глінай цёмнай зелені мундзіру. Дзяўчына спрытна завязала пятлю. Калі ранены адыйшоў, папрасіла ў мяне цыгарэту.

- Ты ў нас новы? - спытала.

Я кіўнуў галавой у адказ і зірнуў на забітых саветчыкаў, што ляжалі некалькі крокаў ад чыгункі.

- Чаму вы не бярэце палонных? - спытаў я.

Яны зьдзіўлена зірнула на мяне.

- Думаеш, што калі хто з нас пападзе ў іхныя рукі, дык яны нас пашкадуюць? Мы не даём спуску, але й ня просім яго. Я, праўда, хоць жанчына, але ўжо прывыкла да гэтага.

- Ты Немец? - спытала па хвіліне.

Я кіўнуў галавой. Кароткая ўсьмешка разуменьня, быццам выбачаючыся за такое пытаньне, мільганула па твары. Пазьней я даведаўся, што гэта была Аляксандра. Яе бацьку саветы расстралялі як "трацкіста". Адна з першых зьявілася яна ў радах антыбальшавікоў. Адзін беларус, што запазнаў мяне з яе лёсам, казаў, што яна вельмі адважная. Ён толькі раз бачыў яе сьлёзы, калі маладога студэнта злавілі пры раскідваньні афішак і пасьля ліквідавалі. Ён, пэўне, быў яе нарэчаным.

МЫ РОБІМ ЦЭЛУЮ РАБОТУ

Таму, што хапала мужчын для разладваньня статку з вагонаў, нас выслалі некалькі кілямэтраў наперад, напэўна, каб забясьпечыць у працягу наступных гадзін далейшую працу. Можна было быць пэўным, што ніякая небясьпека не пагражае. Нават калі б хто з праваднікоў цягніка ўратаваўся, дык трэба было найменш паўдня, каб да наступнага гарнізону дайсьці й трывогу падняць. Было ясна, што спосаб нападу быў добра прадуманы й выкананы.

Адклікалі нас яшчэ перад абедам. Партызаны зрабілі цэлую работу, заваладалі статак у раней нарыхтаваны грузавікі. Гэта ўсё пайшло на папаўненьне запасаў у розных тайных лягерох. Пазьней я даведаўся, што ў гэтай акцыі брала ўдзел больш як дзьвесьце "нялягальных". Уся супраўодная каманда загінула. З боку нападаючых было некалькі параненых.

ПРА "ЗЯЛЕЗНАГА ВАЎКА" Й ІНШЫХ

Наступныя дні прынясьлі цэлую кучу цікавае працы. Камандаваньне "Чорнага Ката" было ўпэўнена, што пасьля нападу на цягнік нахлыне новая хваля прасьледаваньняў. Але не прадбачвалі адкрытае барацьбы із "істрабіцелямі". Гэта была спэцыяльная група, што займалася вынішчэньнем партызанаў ды масавымі арыштамі МВД. Было зразумела, што трэба было мець цясьнейшае супрацоўніцтва з іншымі партызанскімі групамі. Шматлікія кур'ерскія паездкі зьвялі мяне пры гэтым з балтыцкімі групамі, як "Зялезны Воўк" (эстонскія партызаны - С.Д.), "Лясныя Браты" (летувіскія партызаны - С.Д.), дзе я даведаўся аж да драбніцаў пра сілу й дзейнасьць гэтых групаў.

Лік "барацьбітоў" у балтыцкіх краінах, па асьцярожнаму падліку, даходзіў да 20 000. Па новых даведках, між іх было прыблізна 1500 афіцэраў і жаўнераў былае нямецкае арміі. Гэтыя людзі паходзілі з Усходняе Прусіі й большая іх часьць зусім ня была ў савецкім палоне, а некаторыя з лягераў паўцякалі.

ЗАЎВАГА РЭДАКЦЫІ "ЗВАЖАЙ": Аўтар гэтых успамінаў быў на службе "Чорнага Ката" чатыры месяцы, пасьля служыў у балтыцкіх, украінскіх і польскіх рухах супрацьву. Вартасьць ягоных далейшых успамінаў мае вялікую цану для нашых суседзяў, а меншую для нас. І таму тут канчаем друк успамінаў Гасмюлера тым месцам, у каторым ён гаворыць пра нашых:

Вялікае прыкрыцьцё й падтрымку балтыцкім аддзелам давала арганізацыя "Чорнага Ката", да якой я тады належаў.

Гэта арганізацыя паўстала ў 1944 годзе й мае прыблізна да 50 000 сяброў. У гэны лік уключаны таксама сымпатыкі, г.зн. тыя, што падтрымоўваюць яе.

* Міхась Вітушка (1907-1956?), генэрал, арганізатар і кіраўнік Беларускай Вызвольнай Арміі. У 1920-30 гадох вучыўся ў Вільні і Празе. Жыў і працаваў у Варшаве. Падчас 2-ое сусьветнае вайны - афіцэр Беларускае Краёвае Абароны, камандзер экспэдыцыйнай групы спэцыяльнага батальёну "Далвіц", сябра ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі. Пасьля спыненьня партызанскай барацьбы, скрываўся на кансьпірацыйных кватэрах у Вільні й Менску. Арыштаваны і расстраляны бальшавікамі (магчыма, гэта адбылося ў Маскве). У Чырвонай Арміі ген. Вітушка ніколі не служыў, Д.Гасмюлер памыліўся. - С.Д.

** Ад нямецкага "urlaub" - водпуск - С.Д.



ДЫЯНЕТЫКА - ГЭТА АДМЫСЛОВАЯ ТЭХНАЛОГІЯ РОЗУМУ

Напрыканцы 1993 года Міністэрствам юстыцыі зарэгістравана грамадзянская арганізацыя - Беларускі цэнтр дыянетыкі.

Сёньня газета "Пагоня" прапануе аглядны матэрыял А.Дынікава па асновам гэтай навукі.

Адно знаёмства з дыянетыкай дае надзею, што ўсё негатыўнае, якое калі-кольвечы было ў вашым жыцьці і паклаўшае на яго сваё адлюстраваньне, можа быць зьнішчана з вашай памяці ці хоць не прыгнятаць болей.

Ёсьць меркаваньне, што дыянетыка дапаможа нам быць шчасьлівымі, створыць варункі поўнасьцю рэалізаваць сябе і пражыць паўнакроўнае жыцьцё.

Як жа можа дыянетыка ўзьдзейнічаць на чалавека?

Па словах яе стваральніка, амерыканскага навукоўца Лафайета Рон Хабарда, дыянетыка - гэта прыгоды. Гэта дасьледваньне "тэра інкогніта" чалавечага розуму. Кніжка "Дыянетыка", аўтарам якой зьяўляецца навуковец - гэта сучасная навука духоўнага здароўя. Яна зьяўляецца міжнародным бестсэлерам і перакладзена на 22 мовы сьвету, агульным накладам звыш 15 мільёнаў.

У свой час вядомы матэматык Альберт Энштэйн зрабіў сенсацыйную заяву: "Мы выкарыстоўваем толькі 10 працэнтаў здольнасьцяў нашага розуму." Аднак Энштэйн нічога не здолеў сказаць, як задзейнічаць астатнія 90 працэнтаў. Лафайет Рон Хабард у сваіх навуковых досьледах не толькі пацьвердзіў выслоўе вялікага матэматыка, але і распрацаваў сістэму прыёмаў, з дапамогай якіх можна абудзіць і задзейнічаць да працы тую частку чалавечага мозгу, што знаходзіцца ў пасіве.

Лафайет Рон Хабард найперш быў вядомы як пісьменьнік прыгодніцкага і навукова-фантастычнага жанру. Яго працы ў галіне адукацыі, мастацтва, дзэтаксіфікацыі, радыяцыі, кіраваньня бізнесам разышліся па ўсяму сьвету мільённымі накладамі. Хабард вывучаў інжынерную і атамную фізіку, менавіта тады ён распачаў свае першыя вопыты ў вобласьці структуры і функцыянальнай дзейнасьці чалавечай памяці. Дзякуючы назіраньням, зробленым ім падчас сусьветных падарожжаў, вопыту, прыдбанаму ў перыяд Другой сусьветнай вайны і іншым досьледам, выданая 9 траўня 1950 года "Дыянетыка" адразу трапіла ў сьпіс самых папулярных кніжак газеты "Нью-Йорк Таймс". Да канца 1950 года ў ЗША налічвалася каля 750 гуртоў, якія практыкавалі "навуку духоўнага здароўя" Хабарда. Зараз гэтую сістэму псіхалагічнага аздараўленьня выкарыстоўваюць мільёны людзей. Дыянетыка, як методыка духоўнага адпачынку прымяняецца на сусьветна-вядомых прадпрыемствах "Джэнерал мотарс", "Вольва" і многіх іншых.

У чым сакрэт папулярнасьці гэтага аздараўленьчага метада?

Яго сіла ў тым, што па прастаце і эфектыўнасьці ён не мае сябе роўных. Чалавек, дасканала вывучыўшы дыянетыку, можа не толькі сам быць вясёлым, задаволеным жыцьцём аптымістам, але здолее дапамагчы ў гэтай справе свайму бліжняму.

Як засьведчыў Хабард, усе нашыя праблемы, беды хаваюцца ў нашай памяці, якая запісвае ўсю інфармацыю, што даходзіць да нас ад акаляючага асяроддзя.

Адыйшоўшы з часам да скрытых куткоў памяці, інфармацыя незалежна ад жаданьня чалавека ўзьдзейнічае на яго духоўнае становішча і настрой. А так як інфармацыя бывае станоўчая і адмоўная, то і ўзьдзеяньне на чалавека адпаведнае.

Сістэма Хабарда дзякуючы наяўнасьці спецыяльных прыёмаў дазваляе выняць адмоўную інфармацыю з нашага банку памяці, нейтралізаваць яе, пасьля чаго яна робіцца бязшкоднай. Выканаўшы такія захады, чалавек набірае духоўнага здароўя. У яго паляпшаецца памяць, узвышаецца інтэлект, зьніжаецца схільнасьць да хваробаў, стрэсаў.

Вось што нам распавядае на гэта ангельская "Энцыклапедыя натуральнай медыцыны": "З дапамогай дыянетыкі, самагіпнозу ці іншых фізічных сродкаў чалавек сам можа знайсьці першапрычыну сваіх праблемаў."

Пры рэгулярных занятках дыянетыкай жыцьцё чалавека, засцнутае стрэсамі, якое ён бачыць будзённым і шэрым, становіцца яскравым, насычаным і зьмястоўным. Жыцьцё такім людзям уяўляецца цудоўным, захапляючым падарожжам.

Тым, каго зацікавіць дыянетыка, нагадваем кантактны тэлефон - (0172) 55-62-94.

ІНФАКАЛАЖ

ШМАТРАЗОВЫ ТРУС

У лабараторыі дасьледчага ўніверсітэту японскага горада Кэйо вынайдзены гатунак шматразовага падвопытнага труса для абучэньня на ім медперсаналу. Тэхнічнаскладаны трус японскіх вынаходнікаў забясьпечаны сваёй аўтаномнай крывяной сістэмай і мочапалавымі ворганамі. З вуха труса можна браць кроў на аналіз, а з іншых частак цела - разнастайную вадкасьць для патрэбных навуковых досьледаў.

Адзін экземпляр труса каштуе 680 долараў.

* * *

У Кітаі выведзены новы гатунак трускавак. Па памерах кожная ягада пераўзыходзіць курынае яйка. Працы па селекцыі вяліся дзевяць год. Сёлета новым гатункам трускавак у Кітае плануюць засадзіць плантацыі ў некалькі тысяч гектараў. Да гэтага Кітай імпартаваў гэтыя салодкія ягады з Японіі.

* * *

"Зоркі" Галівуда Том Хэнкс, Кевін Вейкан і Рон Хаўэрд, перш чым распачаць здымкі фільма пра палёт у 1970 годзе на Месяц карабля "Апалон-13", сур'ёзна пачалі вывучаць космас.

Можа, сапраўды наведаюць Месяц.

"ЗОРКАВЫЯ ВОЙНЫ": ПРАЦЯГ БУДЗЕ

Брытанскі акцёр Кенэт Бранок у чарговай серыі "Зоркавых войнаў" здымецца ў ролі маладога воіна, якога завуць Обі Ван Кенабі.

ПОЛЬСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

ПАНЯДЗЕЛАК, 14.11

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 09 30 Музычная праграма. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Мы і нашыя дзеці. 10 55 Ангельская мова для дзяцей. 11 05 "Дінастыя Колбі". Серыял вытв. ЗША. 11 55 Музычная праграма. 12 00 Прыемнае з карысным. 12 30 Свет людзей. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Школы ў Еўропе. 14 05 Страціць альбо знайсці. 14 25 Дакументальны серыял. 14 55 І цела і дух. 15 10 З жыцця грыбоў. 15 25 Рэпартаж. 15 35 Ідзе новае. 15 45 Выбар будучыні. 15 50 Праграма дня. 16 00 Музычны часопіс. 16 30 Альтэрнатывы. 17 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 17 25 Праграма для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Публіцыстычная праграма. 19 10 Серыял вытв. Англіі. 19 40 Юбілейная праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 15 Тэлетэатр. 22 25 Мініяцюры. 22 35 Пульс дня. 22 50 Тыдзень прэзідэнта. 23 05 Тэлечасопіс. 23 30 Рэпартаж. 00 00 Навіны. 00 20 "Вялікія планы". Фільм вытв. Францыі. 02 00 Забаўляльная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Прывітанне. 08 30 Ангельская мова. 08 40 Студыя другой праграмы. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Прыгоды пана Міхала". Серыял вытв. Польшчы. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны фільм. 11 00 Мультфільм. 11 30 Тэлетурнір. 12 00 Канцэрт. 12 40 Маі кнігі. 13 00 Брытанскі музей. 13 50 Гэта толькі сплетка. 14 00 Панарама. 14 20 "Гэта цудоўная сямейка". Серыял вытв. Францыі. 15 10 Тэлечасопіс. 15 55 Прывітанне. 16 00 Мультфільм. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Тэлечасопіс. 17 10 Бацькаўшчына. 17 30 Дакументальны фільм. 18 20 Студыя другой праграмы. 18 45 Рэпартаж. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Кола фартуны. 20 35 Мультфільм. 21 00 "Прыпынак Аляска". Серыял вытв. ЗША. 22 00 Панарама. 22 30 Музычная праграма. 23 30 Народны густ. 00 00 Зоў аб дапамозе. 00 40 Публіцыстычная праграма. 01 00 Панарама. 01 05 Спартыўная студыя. 01 15 Музычная праграма.

АЎТОРАК, 15.11

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 "Першыя пацалункі". Серыял вытв. Францыі. 09 30 Праграма для дзяцей. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаварым аб дзецях. 10 55 Ангельская мова для дзяцей. 11 00 Серыял вытв. ЗША. 11 45 Еўрапейскі партрэт. 11 55 Музычная праграма. 12 00 Рынак працы. 12 20 Запрашэнне к сталу. 12 30 Клуб самотных сэрцаў. 12 50 Дамашні юрыст. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 45 Дакументальны фільм. 14 15 Кухня. 14 30 Тэлекамп'ютэр. 14 50 Нашая Балтыка. 15 05 З гісторыі тэхнікі. 15 20 Камп'ютэр для кожнага. 15 45 У свеце навукі. 15 50 Праграма дня. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Маладзёжная праграма. 17 00 "Першыя пацалункі". Серыял вытв. Францыі. 17 25 Праграма для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Арыя са смехам. 18 40 Здароўе. 19 05 Мультсерыял. 19 30 Надзвычайны перагляд. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 Мастацкі фільм. 22 50 Пульс дня. 23 15 Сеймограф. 23 30 Пісьма аб гаспадарцы. 00 00 Навіны. 00 20 Дакументальны фільм. 01 10 Тэлечасопіс. 02 20 Праз мара і ільды. 02 30 Музычная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Прывітанне. 08 30 Ангельская мова. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Прыгоды пана Міхала". Серыял вытв. Польшчы. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 Фільм для дзяцей. 11 30 Тэлетурнір. 12 00 Дакументальны фільм. 12 45 Музычная праграма. 13 40 Мой маленькі свет. 14 00 Панарама. 14 20 "Забароннае каханне". Серыял вытв. Іспаніі. 15 05 Тэлечасопіс. 15 55 Прывітанне. 16 00 Фільм для дзяцей. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Дакументальны фільм. 17 30 Сум і мары. 18 00 Тэлечасопіс. 18 10 Пісьма з Еўропы. 18 30 Кракаўскія легенды. 18 40 Каталіцкая праграма. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Мультфільм. 21 00 Публіцыстычная праграма. 21 50 Тэлечасопіс. 22 00 Панарама. 22 30 Экалагічная праграма. 22 40 Рэпарцеры прадстаўляют. 23 00 "Імям айца і сына". Фільм вытв. Італіі. 00 20 Тэлечасопіс. 01 00 Панарама. 01 05 Спартыўная праграма. 01 15 "Нераўная пара". Фільм вытв. Германіі.

СЕРАДА, 16.11

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 09 30 Праграма для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаварым аб дзецях. 10 55 Ангельская мова для дзяцей. 11 00 "Фартурна". Камедыя вытв. Польшчы. 12 00 Ад калыскі да школы. 12 30 Культурна-публіцыстычны журнал. 12 55 Наша грамадзтва. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнесс. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Дакументальная праграма. 13 50 Граматыка. 14 05 Сучасная польская проза. 14 35 Сустрэча з літаратурай. 15 05 Гісторыя польскага радыё. 15 20 Філосаф у любы час. 15 55 Праграма на вечар. 16 00 Маладзёжная музыка. 16 30 Для моладзі. 16 55 Музычная праграма. 17 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 17 25 Праграма для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Спартыўная студыя. 20 20 Вечарынка. 20 40 Навіны. 21 20 "Карошы". Фільм вытв. ЗША. 22 55 Пульс дня. 23 15 Дакументальны фільм. 23 30 Дакументальны фільм. 00 00 Навіны. 00 20 "Брунэт вячэрняю парой". Камедыя вытв. Польшчы. 01 50 Дакументальны фільм.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 30 Курс ангельскай мовы. 08 40 Раніца другой праграмы. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Шэрлак Холмс і доктар Ватсан". Серыял вытв. Англіі. 10 00 Трансляцыя паседжанняў сейма. 14 00 Панарама. 15 55 Прывітанне. 16 00 Мультфільм. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Жывелы вакол нас. 17 30 Тэлечасопіс. 18 00 Дакументальны фільм. 18 55 Розыгрыш лато. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Забаўляльная праграма. 21 00 "Сымон Візенталь". Дакументальны фільм. 21 45 Цені жыцця. 22 00 Панарама. 22 30 Экспрэс рэпарцераў. 23 05 Кінааповяд. 00 15 Сімфанічны канцэрт. 01 10 Панарама. 01 15 Спартыўная студыя. 01 25 Музычнае прадстаўленне.

ЧАЦВЕР, 17.11

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата. 08 05 Мініяцюры. 09 00 "Дзіцячае аддзяленне". Серыял вытв. Англіі. 09 30 Для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма для дзяцей. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаварым аб дзецях. 10 55 Ангельская мова для дзяцей. 11 05 "Спякота тропікаў". Серыял вытв. ЗША. 11 55 Музычная праграма. 12 00 Кулінарная праграма. 12 20 Гэта лёгка. 12 30 Чвэрць гадзіны на экране. 12 45 Жыць бяспечна. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнесс. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Сустрэча з прыродай. 14 00 Паміж намі жывёламі. 14 20 Жывёлы свету. 14 50 Рабінзоны. 15 10 Тэлечасопіс. 15 25 Першы год жыцця рабенка. 15 50 Праграма дня. 16 00 Маладзёжная музыка. 16 30 Для маладых гледачоў. 17 00 "Дзіцячае аддзяленне". Серыял вытв. Англіі. 17 25 "Дзе Валлі?". Серыял вытв. Англіі. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Кіначасопіс. 18 40 Такі свет. 19 05 "Маленькі цуд". Серыял вытв. ЗША. 19 30 Каталіцкая праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Спякота тропікаў". Серыял вытв. ЗША. 22 05 Толькі па першай праграме. 22 50 Сатырычная праграма. 23 00 Урадавы журнал. 23 10 Вайсковы журнал. 23 25 Пегас. 00 00 Гаспадарчыя навіны. 00 50 "Даносчыца". Фільм вытв. Германіі. 02 20 Трыптых.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 30 Курс ангельскай мовы. 08 40 Раніца. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Шэрлак Холмс і доктар Ватсан". Серыял вытв. Англіі. 10 00 Трансляцыя паседжанняў сейма. 14 00 Панарама. 15 55 Прывітанне. 16 00 "Тарзан". Серыял вытв. Германіі. 16 30 Летны часопіс. 17 00 Роля разуму. 17 30 Музычная праграма. 18 00 Рэпартаж. 18 30 Забытыя пісменнікі. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Кола фартуны. 20 35 Клуб спадара Рыся. 21 00 Спартыўная студыя. 22 00 Панарама. 22 35 Аўтачасопіс. 23 00 "Цемра гораду". Фільм вытв. ЗША. 01 00 Панарама. 01 05 Спартыўная праграма. 01 15 Арт-ноч.

ПЯТНІЦА, 18.11

ПРАГРАМА 1

07 00 Кава ці гарбата. 09 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 09 30 Праграма для дзяцей. 09 55 Гімнастыка. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма для дзяцей. 10 25 Дашкольнікі дома. 11 00 "Маладыя ездакі". Фільм вытв. ЗША. 11 50 Музычная праграма. 12 00 Школа для бацькоў. 12 15 Сшый сама. 12 30 Журнал нацыянальных меншасцяў. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 45 Якая школа? 13 50 Дакументальная праграма. 14 05 Хто ты есць? 14 20 Стан душы. 14 45 Калі не Оксфард, дык што? 14 50 Хто першы - той лепшы. 15 25 Бізнес па амерыканску. 15 55 Праграма дня. 16 00 Музычны тэлетурнір. 16 30 Танцавальны турнір. 16 55 Музычная праграма. 17 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 17 25 Для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Тэлечасопіс. 18 30 Штотыднеўнік культуры. 18 40 Тэлечасопіс спажыўца. 19 05 Спаткане ўцемную. 19 50 Сатырычная праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Шчаслівы Аляксандр". Фільм вытв. Францыі. 22 45 Пульс дня. 23 00 Чвэрць гадзіны. 23 15 Справа для рэпарцёра. 00 00 Навіны. 00 15 Блізкія сустрэчы. 00 45 "Бруклін" Фільм вытв. ЗША. 02 25 Танцавальный турнір.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 30 Курс ангельскаай мовы. 08 40 Раніца. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 Серыял вытв. Даніі. 10 00 Трансляцыя паседжанняў сейма. 14 00 Панарама. 15 55 Прывітанне. 16 00 Праграма для дзяцей. 16 30 Спартыўная студыя. 17 30 "З дзевяці да пяці". Камедыйны серыял вытв. ЗША. 18 00 Дакументальны фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Адзін з дзесяці. 20 35 Тэлечасопіс. 21 00 Амерыканцы ў Варшаве. 22 00 Панарама. 22 30 Забаўляльная праграма. 22 45 Мастацкі фільм. 00 40 Тэлечасопіс. 01 00 Панарама. 01 05 Спорт. 01 15 Рок-фестываль.

СУБОТА. 19.11

ПРАГРАМА 1

08 00 З Польшчы. 08 10 Прашу адказаць. 08 25 Усе аб агародзе. 08 50 Агралінія. 09 30 Спартыўны тэлечасопіс. 09 55 Праграма дня. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма каталіцкай рэдакцыі для дзяцей. 10 35 Праграма для дзяцей. 12 00 Дакументальны фільм. 12 50 Тэлечасопіс. 13 00 Навіны. 13 10 Тэлечасопіс. 13 45 Жывелы свету. 14 20 Мультфільмы У. Дыснея. 15 35 Тэлетэатр. 16 45 Дай шанц рабенку. 17 00 Тэлечасопіс мясцовых праграм. 17 25 "Сямейнае прадпрыемства". Камедыйны серыял вытв. Польшчы. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Тэлечасопіс. 18 50 Забаўляльная праграма. 19 10 "Беверлі Хілз". Серыял вытв. ЗША. 20 00 Дзіцячы тэлечасопіс. 20 10 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Хлопец з клуба Фламінга". Камедыя вытв. ЗША. 23 05 Звычайныя - надзвычайныя. 23 20 Дакументальны фільм. 23 45 "Другая". Дакументальны фільм. 00 00 Навіны. 00 10 Спартыўная субота. 01 10 "Фатальны кадр". Фільм вытв. ЗША. 02 40 "Самотнае сэрца". Фільм вытв. ЗША. 04 15 Музычная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Панарама. 08 10 Музычная раніца. 08 30 Такія самотныя. 08 50 Урок мовы глуханямых. 08 55 Прывітанне. 09 00 Таварыства ў культуры. 09 30 Мультфільм. 10 00 Мясцовая праграма. 11 00 Польская армія. 11 30 Праграма аб жывелах. 12 00 Праграма для дзяцей. 13 00 Акадэмія польскага кіно. 14 30 Забаўляльная праграма. 15 00 Зоркі тых гадоў. 15 30 Жыцце побач з намі. 16 00 Спартыўная студыя. 16 30 Прывітанне. 16 45 Тэлечасопіс. 17 00 Серыял вытв. ЗША. 17 30 Тэлетурнір. 18 00 Канцерт. 18 55 Розыгрыш лато. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 19 30 Семь дзен - свет. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Тэлечасопіс. 21 00 Забаўляльная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Слова на нядзелю. 22 35 Музычны часопіс. 23 20 "Джэсі Джемс". Вестэрн вытв. ЗША. 01 00 Панарама. 01 05 Рок-ноч.

НЯДЗЕЛЯ, 20.11

ПРАГРАМА 1

08 00 Сельская гаспадарка ў свеце. 08 15 Далека і блізка. 08 30 Тыдзень. 09 00 Сельскагаспадарчая праграма. 09 25 Праграма дня. 09 30 Нядзельная кінапраграма. 09 55 Тэлераніца. 10 20 Музычная скрыня. 10 45 Серыял вытв. Канады. 11 10 Тэлетэатр для дзяцей. 12 00 Навіны. 12 10 Дакументальны серыял. 13 05 Тэлеканцэрт пажаданняў. 13 35 С камерай сярод звяроў. 13 50 Квант. 14 10 Мора. 14 45 У старым кіно. 16 30 Сто пытанняў. 17 10 Спартыўная студыя. 17 35 Антэна. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Варта пасмяяцца. 19 00 "Дынастыя Колбі.". Серыял вытв. ЗША. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Па зову сэрца". Серыял вытв. Італіі. 22 05 Спартыўнаая нядзеля. 22 30 Серыял вытв. ЗША. 22 50 Публіцыстычная праграма. 23 20 Вечар з Аліцыяй. 00 20 "Гарольд і Мауді". Фільм вытв. ЗША. 01 50 Музычная праграма.

ПРАГРАМА 2

08 00 Рэха тыдня. 08 30 Фільм для глухіх. 09 15 Слова на нядзелю. 09 20 Прывітанне. 09 30 Тэлечасопіс. 10 00 Мясцовая праграма. 11 00 Дакументальны фільм. 12 00 Мультфільмы для дзяцей. 13 00 "Лукі Лук". Серыял вытв. Італіі. 13 50 Духі, замкі, упыры. 14 25 Каляровыя песні. 15 00 Падарожжа ў часе і прасторы. 15 55 Тэлечасопіс. 16 00 Тэлетэатр для дзяцей.. 16 35 Публіцыстычная праграма. 16 50 Другая праграма. 17 00 "Як есць". Серыял вытв. Польшчы. 17 30 Тэлетурнір. 18 00 Тэлечасопіс. 19 00 Падзеі тыдня. 19 25 Спартыўная студыя. 19 50 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Мультфільм. 21 00 Спецыяльная лінія. 22 00 Панарама. 22 30 Кабарэ. 23 25 "У цені дзікіх пальм". Серыял вытв. ЗША. 00 10 Тэлетэатр. 01 20 Панарама. 01 30 Спартыўная студыя.



ПАНЯДЗЕЛАК 14.11

Беларускае тэлебачанне

9.05 Дзелавы веснік 9.20 Пяць хвілін на жарты 9.30 Беларускі тур. Падарожжы і сустрэчы 9.50 "Чарапашкі ніндзя". Мультсерыял для дзяцей і дарослых 10.40 "Па сакрэту ўсяму свету". Маст. фільм 12.40 "АВС-клуб" у Амерыцы 12.55 "Любачка-галубачка мая". Памяці заслужанай артысткі Беларусі Ганны Рыжковай 13.55 Настальгічны дывертысмент. Гісторыя Давта Беларусі ў асобах. Перадача 4-я 15.10 Чарнобыльскі след 15.45 "Вешчая птушка". Дак. фільм 16.45 Гісторыя Беларусі. Асвета і культура Беларусі ў канцы XVIII-першай палове XIX ст. 16.40 "Бімбат". "Вясёлка" у Радавішчах 17.00 Навіны (с сурдаперакладам) 17.10 Якія мы гаспадары? Магілёўскае ВА "Хімвалакно" 17.40 Праспект. Інфармацыйна-аналітычная праграма 18.10 Дзённік Прынёмання (Гр.) 18.35 Цэнтр Хрысціянскага развіцця "Сатварэньне" прапануе... 19.05 Незабыўнае: вайна і людзі (Гр.) 19.25 Веснік гарсавета (Гр.) 19.40 Закон і слова 20.00 "Высокі стыль". Мірская мастацкая школа 20.15 Імгненьне шчырасьці 20.20 Пяць хвілін на жарты 20.25 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя 20.30 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Спартыўны тэлекур'ер 22.00 Тэлевізійны Дом кіно. III Міжнародны кінафестываль "Залаты Віцязь" 23.20 НІКа 23.35 Дайджэст 23.45 Пад купалам Сусвету 23.55 "Паласа Сімарона". Маст. фільм (ЗША)

Канал "Астанкіна"

14.50,15.50,20.00,22.50 Навіны 15.00 Комікс-бум 15.30 Зорны час 16.20 "Элен і хлапчукі". Фільм вытв. Францыі 16.45 Мультфільм 16.50 Свет сёння 17.00 Лабірынт 17.30 Зоркі Расіі - дзецям. Хакей. ЦСКА-"Зоркі Расіі". У перапынку - надвор'е 18.10 Гадзіна-пік 19.00 Добрай ночы, малышы! 20.40 Калі ... Вядучы - В.Познер 21.25 Тэатр + TV 22.10 Кабарэ "Усе зоркі" 23.05 Шэсць вечароў з Ю.Нікуліным 23.45 У цішы. Мульт. для дарослых 23.50 Прэс-экспрэс 00.00 Тэлемемуары

Канал "Расія"

16.55 Правінцыяльныя пісьмы. "Дваранскае гняздо" 17.25 Выратаванне 911 18.20 Вуснамі немаўляці 18.50 "Ніхто не забыты" 19.00 Весткі 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Спрут-6". Маст. ф. Італія 20.40 Рэпарцёр 21.00 Момант ісціны 22.00 Весткі 22.20 Рака часу 22.25 Аўтаімгненне 22.30 Спартыўная карусель 22.35 Хто мы? 23.20 Джаз-клуб 23.55 Зоркі гаворань 23.55 Новы ілюзіён. "Чакайце..."

Санкт-Пецярбург

6. 30 Пазабюджэтнае вяшчанне. Тэлеканал "Добрая раніца" 12. 00,14 30,18 30,21 30 Інфарм-ТБ 12. 10 Чароўная лінія 12. 25 "Нямецкая хваля" 13. 00 Тэст 13. 30,19. 25 "Каміла ці Нераскрытыя таямніцы" 58-я серыя 14. 40 "Страсці".17-я серыя 16. 15 Падарожжа па Ўсходу 16. 30 Будні 16. 45 "Як трапіць у Лукамор'е", перадача 1-я 17. 05 Выбары-94. Тэледэбаты 17. 55 Чалавек на зямлі 18. 50 Спорт, спорт, спорт... 19. 10 Вялікі фестываль 20. 15 "Аркестр", музычны тэлефільм 20. 40 Небяспечная прафесія - журналіст. Прамы эфір 21. 10 Тэлемагазін 21. 15 Тэлеслужба бяспекі 21. 45 Спартыўныя навіны 22. 00 Ваш стыль 22. 05 "Да запатрабавання". Фільм

АЎТОРАК 15.11

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны 8.10 Дайджэст 8.20 Пяць хвілін на жарты 8.25 "Мелодыі экрана". Фільм-канцэрт 9.00 Гісторыя Беларусі. Асвета і культура Беларусі ў канцы XVIII-першай палове XIX ст. 9.25 "Паласа Сімарона". Маст. фільм (ЗША) 10.40 "Бімбат". "Вясёлка" у Радавішчах 11.00 Чароўны экран. "Дыназаўрыкі". Мульт. 1-я серыя 11.35 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды". Маст. фільм (ЗША) 1-я серыя 12.10 Позірк у будучыню. "Пасьля 2000 года" 13.05 Урокі здароўя 13.45 Тэлеклуб "Гаў-гаў" 14.10 "Нов і К"-топ-10 15.15 Вывучаем сваю гісторыю. "Пад знакам Пагоні". Дак. фільм 15.30 "Горад майго юнацтва. Мсціслаў". Тэленарыс 16.00 Беларуская літаратура. В.Дунін-Марцінкевіч. Камедыя "Пінская шляхта" 16.40 "Бімбат" 17.00 Навіны (с сурдаперакладам) 17.10 "Маё каханьне, мой смутак". Тэлесерыял 18.10 Дзёньнік Прынёманьня (Гр.) 18.20 Лідзкая панарама (Гр.) 18.40 Рынак і эканоміка. Ільнозавод МВА "Маналіт" у Навагрудку 19.00 Віктарына праграмы "Вячэрні канал" (Гр.) 19.10 Эканамічная хваля. Аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасьці. Прамая лінія 19.25 Тэледыялог. У студыі — саветнік прэзідэнта Беларусі С.А.Посахаў (Гр.) 20.25 Пяць хвілін на жарты 20.30 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Пад купалам Сусвету 21.40 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 1-я серыя 22.40 Футбол. Зборная Беларусі — зборная Нарвегіі. Чвэрць гадзіны напярэдадні матча 23.00 НІКа 23.15 Дайджэст 23.25 Канцэрт-прэзентацыя сімфанічнага аркестра дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі 00.25 Сталіца. Тэлечасопіс

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца 6.50, 7.50,8.50,9.50,14.50,15.50,17.50,20.00,22.50 Навіны 8.00 "Вайна гобатаў" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Амерыка з М.Таратутай 15.00 Домісолька 15.30 Паміж намі, дзяўчынкамі 16.00 Джэм 16.25 "Элен і хлапчукі" 16.50 Свет сёння 17.00 Ведзі 17.30 Загадка СБ 17.45 Дакументы і лёсы 18.00 Гадзіна-пік 18.30 "Дзікая Роза" 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 З першых рук 20.50 Клічу жывых. Маст. ф. "Пяць дзён - пяць начэй" 23.05 У свеце джаза 23.25 Відэамікс 23.50 Прэс-экспрэс 00.00 Танцы, танцы...

Канал "Расія"

6.30 Формула-730 7.00 Весткі 7.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі 8.25 "Гандлёвы дом" 8.40 Ранішні канцэрт 8.50 Момант ісціны 9.45 "Каралева Елізавета ў Расіі" 10.30 Кліп-антракт 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 11.00,15.00 Весткі 15.20 Маст.ф. "Жарабя-махляр" 15.45 Кліп-антракт 15.50 Там-там навіны 16.05 Свята кожны дзень 16.15 Новая лінія 16.55 "Не быць дыназаўрам" 17.10 Галасы. Маладзёжная праграма 17.40 Павестка дня 18.05 L-клуб 19.00 ВЕсткі 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Пахвальнае слова беднасці..." 20.10 Ніхто не забыты 20.15 "Амар, Акбар, Антані" Маст.ф. Індзія. 1-ая серыя 22.00 Весткі *22.20 Рака часу 22.25 Аўтаімгненне 22.30 Спар*тыўная карусель 22.35 "Амар, Акбар, Антані". 2-ая серыя 00.10 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

6 30 Пазабюджэтнае вяшчанне. Тэлеканал "Добрая раніца" 12 00,14 30,18 30,21 30 Інфарм-ТБ 12 10 Чароўная лінія 12 25 "Нямецкая хваля" 13 00 Хуткая дапамога 13 30,19 25 "Каміла ці Нераскрытыя таямніцы" 59-я серыя 14 30,21 10 Тэлемагазін 14 45 "Мой сябр Іван Лапшын" Фільм 16 25 Мультфільмы 16 45 "Тры калы,фаліянт і..." 17 05 Выбары-94. Тэледэбаты 17 55 Па ўсей Расіі 18 50 Спорт, спорт, спорт... 19 10 Вялікі фестываль 20 15 Падсякай 20 30 Тэатральны бінокль 21 15 Тэлеслужба бяспекі 21 45 Спартыўныя навіны 21 55 Ваш стыль 22 05 "Энэргічныя людзі". Спектакль

СЕРАДА 16.11

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны 8.10 Пяць хвілін на жарты 8.15 Дайджэст 8.25 Планета людзей 8.45 Вытокі. Урокі беларускай мовы 9.00 Беларуская літаратура 9.40 "Маё каханьне, мой смутак". Тэлесерыял 10.40 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 1-я серыя 11.30 "Бімбат" 11.50 Чароўны экран. "Дыназаўрыкі". Мульт. 2-я серыя 12.25 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды". Маст. фільм (ЗША) 2-я серыя 12.55 Футбол. Зборная Беларусі — зборная Нарвегіі 14.50 Мультфільм 15.10 Позірк у будучыню. "Пасьля 2000 года" 16.10 Вывучаем сваю гісторыю. "Абразы". Дак. фільм 16.30 "Бімбат" 17.00 Навіны (с сурдаперакладам) 17.10 "Маё каханьне, мой смутак". Тэлесерыял 18.10 Дзёньнік Прынёманьня (Гр.) 18.20 Гарадніца. Літаратурна-мастацкая праграма (Гр.) 19.15 Футбол. Зборная Беларусі — зборная Нарвегіі 20.50 Калыханка 21.10 Панарама 21.50 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя 21.55 Пяць хвілін на жарты 22.00 "Пяць зорак". Тэлегульня 23.00 Пад купалам Сусвету 23.10 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 2-я серыя 00.05 Футбол. Зборная Беларусі — зборная Нарвегіі. Чвэрць гадзіны пасьля матча 00.20 Дайджэст 00.30 Футбол. Зборная Беларусі — зборная Нарвегіі.

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца 6.50,7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50. 17.50, 21.00 Навіны 8.00 "Апавяданне пра Ігараў паход" Мульт. 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Клуб падарожнікаў 15.00 Паглядзі - паслухай 15.20 Адказы 16.00 Цін-тонік 16.25 "Элен і хлапчукі" Серыял Францыі 16.50 Свет сёння 17.00 У эфіры "Мір" 17.20 Дзень добры, гэта я 17.45 Дакументы і лёсы 18.00 Гадзіна-пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 Кінапанарама 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Маналог 20.50 "Згублены сюжэт" Л.Зорын 21.45 Мініяцюра 21.55 Футбол. Зборная Шатландыі - зборная Расіі 23.50 Прэс-экспрэс 00.00 Я вам спяю

Канал "Расія"

6.30 Формула-730 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі 8.25 "Гандлёвы дом" 8.40 Мемуары. К.Ваншэнкін о Я.Фрэнкеле 9.05 Добра жывеш 9.20 А.Шнітке. Канцэрт 9.45 "Санта-Барбара" 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 15.20 Студыя "Рост" 15.50 Там-там навіны 16.05 Свята кожны дзень 16.15 Новая лінія 16.55 Казкі для бацькоў 17.25 Кліп-антракт 17.35 Людзі 19.25 Пабрабязнасці 19.35 "Санта-Барбара" 20.30 Я - лідэр 21.00 60 хвілін 22.20 Рака часу 22.25 Аўтаімгненне 22.30 Спартыўная карусель 22.35 Тэатральны раз'езд 22.20 Экран крымінальных звестак 23.35 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

6 30 Пазабюджэтнае вяшчанне. Тэлеканал "Добрая раніца" 12 00,14 30,18 30,21 30 Інфарм-ТБ 12 10 Чароўная лінія 12 25 "Нямецкая хваля" 12 55 Хуткая дапамога 13 25,19 30 "Каміла ці Нераскрытыя таямніцы" 60-я серыя 14 40,21 10 Тэлемагазін 14 50 Наша кіно. "Ка-ка-ду" Маст. фільм 15 55 К.Паустоўскі "Стары ў пацертай шынелі" 16 30 Будні 16 45 "Як трапіць у Лукамор'е" передача 2-я 17 05 Выбары-94. Тэледэбаты 17 55 Гістарычны альманах 18 50 Спорт, спорт, спорт... 19 10 Вялікі фестываль 20 35 Блеф-клуб 21 15 Тэлеслужба бяспекі 21 45 Спартыўныя навіны 21 55 Ваш стыль 22 05 Дэтэктыў на тэлеэкране."У хаце насупраць"

ЧАЦВЕР 17.11

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны 8.10 Пяць хвілін на жарты 8.15 Дайджэст 8.25 "Маё каханьне, мой смутак". Тэлесерыял 9.25 Тэлевізійны "Арт-клуб" прадстаўляе. "Мой горад, мяне не забыў ты яшчэ..." I міжнародны плэнер імя Марка Шагала 9.55 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 2-я серыя 10.45 "Бімбат" 11.15 Чароўны экран. "Дыназаўрыкі". Мульт. 3-я серыя 11.50 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды". Маст. фільм (ЗША) 3-я серыя 12.20 Позірк у будучыню. "Пасьля 2000 года" 13.20 "Пяць зорак". Тэлегульня 14.20 Еўрапейскі калейдаскоп 14.50 "Талент жыць". Сустрэча з народнай артысткай Беларусі З.І.Браварскай 15.50 Вывучаем сваю гісторыю. "Партрэт на фоне часу". Дак. фільм 16.10 Беларуская літаратура. Паэзія Пімена Панчанкі 16.40 "Бімбат" 17.00 Навіны (с сурдаперакладам) 17.10 "Маё каханьне, мой смутак". Тэлесерыял 18.10 Навіны (Гр.) 18.25 Міжнародны год сям'і ў Гродна. Няпоўныя сем'і (Гр.) 19.00 "Ачышчэньне" правярае факты. (Гр.) 19.50 ТВК "Крок". "Наўцілус" 20.10 Крэда. Праграма для дзелавых людзей 20.30 Пяць хвілін на жарты 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Студыя "Формула" 23.05 Пад купалам Сусвету 23.15 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 3-я серыя 00.10 НІКа 00.25 Дайджэст

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны 8.00 "Зайцава школа" Маст.ф. 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 У свеце жывёл 9.40 Эксілібрыс 15.00 Мульцітролія 15.30 На бале ў Папялушкі 16.00 Цім-інтым 16.25 "Элен і хлапчукі" Маст.ф. Францыя 16.50 Свет сёння 17.00 ...Да 16 і старэйшым 17.30 "Жыў на свеце чалавек" Дак.ф. 17.45 Дакументы і лёсы 18.00 Гадзіна-пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 Аўтарская праграма Г.Баравіка 19.40 Добрай ночы, малы*шы! 20.40 Масква - Крэмль 21.00 Лато "Мільён"* 21.30 "Становішча рэчаў" Маст.ф. ФРГ 00.00 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.30 Формула-730 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі 8.25 Паехалі 8.35 Непапулярная тэма 8.50 Ранішні канцэрт 9.05 "Расія распятая" 9.45 "Санта-Барбара" 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 15.20 "Музычны клас лЯ Чорнага мора", "Выратуйце нашы душы". 15.50 Там-там навіны 16.05 Свята кожны дзень 16.15 Новая лінія 16.55 Фільм-прэм'ер 17.10 Будні 17.50 Хрона 18.20 "Пяць хвілін пра добрае жыццё" 18.25 Свая гульня 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Санта-Барбара" 20.30 Вялікі скандал 21.05 Надзвычайны канал 22.20 Рака часу 22.25 Аўтаімгненне 22.30 Спартыўная карусель 22.35 Экран крымінальных звестак 22.45 "Люстэрка свабоды" 23.15 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

6 30 Пазабюджэтнае вяшчанне. Тэлеканал "Добрая раніца" 12 00,14 30,18 30,21 30 Інфарм-ТБ 12 10 Чароўная лінія 12 25 "Нямецкая хваля" 13 00 Хуткая дапамога 13 30 Урок нямецкай мовы 13 45 Еўрапейскі калейдаскоп 14 15 "В.Сурыкаў. Пакарэнне Сібіры Ермаком" 14 45 "Дрэнны добры чалавек" Фільм 16 20 Казка за казкай. Адказы на лісты 17 05 Выбары-94. Тэледэбаты 17 55 Пецярбургская лінія 18 50 Спорт, спорт, спорт... 19 10 Вялікі фестываль 19 30 Ура,камедыя! "Дзе знаходзіццаа нафелет" 20 50 "Гібель Розы" Фільм-балет 21 10 Тэлемагазін 21 15 Тэлеслужба бяспекі 21 45 Спартыўныя навіны 21 55 Ваш стыль 22 05 Парад парадаў 23 05 Хакей. Кубак МХЛ

ПЯТНІЦА 18.11

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны 8.10 Пяць хвілін на жарты 8.15 Дайджэст 8.25 Крэда. Праграма для дзелавых людзей 8.45 Мультфільм 9.00 Беларуская літаратура. Паэзія Пімена Панчанкі 9.30 "Маё каханьне, мой смутак". Тэлесерыял 10.30 "У нас дома". Праграма для сям'і 11.05 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 3-я серыя 11.50 "Бімбат" 12.10 Чароўны экран. "Дыназаўрыкі". Мульт. 4-я серыя 12.45 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды". Маст. фільм (ЗША) 4-я серыя 13.20 "Самазванец з гітарай". Камедыя вытв. Польшчы 13.40 Позірк у будучыню. "Пасьля 2000 года" 14.15 ТВК "Крок". "Наўцілус" 14.35 Навіны кіна-відэа-аўдыё 15.35 Вывучаем сваю гісторыю. "Францыск, сын Скарыны". Дак. фільм 16.35 "Бімбат" 17.00 Навіны (с сурдаперакладам) 17.10 "Палесься мілае дзіця". Я.Янішчыц 17.55 Шукаем ініцыятыўных. Беларуска-румынскі гандлёвы дом "Беларум" 18.10 Дзёньнік Прынёманьня (Гр.) 18.25 Толькі па пятніцах (Гр.) 19.20 Планета людзей. Міжнародная праграма(Гр.) 20.05 Падарункі на добры настрой 20.20 Пяць хвілін на жарты 20.25 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя 20.30 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 "Таміра" прапануе: "Расстаёмся пакуль добрыя". Маст. фільм. 1-я серыя 22.55 Пад купалам Сусвету 23.05 "Вялікія паветраныя гонкі". Маст. фільм (Велікабрытанія) 4-я серыя 00.00 НІКа 00.15 Дайджэст 00.25 Лета фестывальная. "Славянскі базар-94". Канцэрт артыстаў польскай эстрады

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца 6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны 8.00 "Сарока" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Дарога. Аб будаўніцтве аўтамагістралі Омск-Навасібірск 9.30 Канцэрт дзяржаўнага ансамбля танца Казахстана 15.00 У гасцях у казкі 16.25 Рок-урок 16.50 Свет сёння 17.00 Чалавек і закон 17.30 Галасы Расіі 17.40 Дакументы і лёсы 18.00 Бамонт 18.25 "Дзікая Роза" 18.50 "Поле цудаў" 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.40 Чалавек тыдня 21.00 "Вуліцы Сан-Францыска" Тэлесерыял ЗША 22.05 Погляд з А.Любімавым 23.05 Музабоз 23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.30 Формула-730 7.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца... 7.30 Час дзелавых людзей 8.00 Сусветныя навіны Эй-бі-сі 8.25 Паехалі 8.35 У свеце жывёл 9.30 Ранішні канцэрт 9.45, 19.35 "Санта-Барбара" 10,35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 15.20 Студыя "Рост" 15.50 Там-там навіны 16.05 Свята кожны дзень 16.15 Новая лінія 16.55 Дысней па пятніцах 17.55 Музыка на дэсерт. 18.10 Кар'ера 19.25 Пабрабязнасці 20.30 Маскі-шоу 21.05 "К-2" прадстаўляе: "Абзац" 22.20 Рака часу 22.25 Аўтаімгненне 22.30 Спартыўная карусель 22.35 "Адчай" Маст.ф.Германія 0.45 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

6 30 Пазабюджэтнае вяшчанне. Тэлеканал "Добрая раніца" 12 00,14 30,18 30,21 30 - Інфарм-ТБ. 12 10 Чароўная лінія 12 25 "Нямецкая хваля" 12 50,14 25.19 05 Музычны момант 13 00 Хуткая дапамога 13 30 Куток Расіі."Творчасць Фядоскіна" 13 55 Музычны тэлефільм 14 10,16 00 Мультфільм 14 40 Ура,камедыя! "Дзе знаходзіцца нафелет" 16 20 Будні 16 30 Кідайка 16 05 Выбары-94. Тэледэбаты 17 55 Храм 18 50 Спорт, спорт, спорт... 19 10 Вялікі фестываль 19 30 "Я аб'яўляю вам вайну" Фільм 21 00 "В.Паленаў."Хрыстос і грэшніца" 21 10 Тэлемагазін 21 15 Тэлеслужба бяспекі 21 45 Спартыўныя навіны 21 55 Ваш стыль 22 05 "Звар'яцелы тэрарыст" Фільм (ЗША)

СУБОТА 19.11

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны 8.10 Дайджэст 8.20 Аэробіка для ўсіх. Урокі Н.Наважылавай 8.50 Пяць хвілін на жарты 8.55 Экамікст 9.05 "Таміра" прапануе: "Расстаёмся пакуль добрыя". Маст. фільм. 1-я серыя 10.20 Здароўе 11.05 Банка комікаў. Гумарыстычная праграма 11.35 Шматгалоссе. Народы Беларусі 12.25 Тэлевізійны "Арт-клуб" прадстаўляе "Тут засталася мая душа..." Нататкі з Шагалаўскага пленэра 13.05 Сваімі рукамі. Пляценьне з саломкі 13.20 "Лулу — анёл кветак". Мульсерыял 13.55 "Званы пекла" Асьветніцкая праграма 14.25 Асілак. Спартыўны клуб 15.15 "Турэцкі марш". Тэленарыс 15.35 "Песьню бярыце з сабою". Тэлефестываль у Салігорску. Частка 1-я 17.25 Тэлерэклама 17.35 "Чарапашкі ніндзя" Мультсерыял 18.00 "Пяць хвілін на жарты". У нас — юбілей 19.00 "Нов і К"-топ-10 20.00 Міжнародныя спартыўныя навіны 20.30 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 "Пераборлівы жаніх". Маст. фільм. 23.25 Пад купалам Сусвету 23.35 Фаварыты года. Адк*рыццё тэлевізійнага музычнага фестывалю.* Частка 1-я 01.25 "Каскад" 01.45 Відзьманявідзьма. Навіны кіна-відэа-аўдаё

Канал "Астанкіна"

6 30 Суботняя раніца дзелавога чалавека 7 15 Спорт-шанц 7 45 "Слова пастыра" Мітрапаліт Кірыл 8 00 Зоў джунгляў 8 30 Спектр 8 40 Крымскія татары. З цыкла "другія" 9 15 "Профі-шоу" 10 00 Ранішняя пошта 10 30 Медыцына для цябе 11 00 Без паўзы 11 15 Смак 11 30 Фільм "Генерал" 13 00 Мультфільм 13 10 Дыялог у прамым эфіры 13 50,22 50,23 50 Навіны 14 00 "Вікторыя" 14 35 "Пасціжэнне дэмакратыі" Фільм 7-й 15 35 Нам і нашчадкам 16 10 "Жыццё заапаркаў" 16 50 Разумнікі і разумніцы 17 45 "Перад і пасля..." 18 40 "Каманда ў капелюшах" 6-я серыя 19 40 "Добрай ночы,малышы" 20 00 Навіны плюс 20 35 Надвор'е 20 45 "Гаспадар Балантрэ" 3-я серыя 22 00 Клуб "Белы папугай" 22 55 Фільм "Тэраса" 2 00 "Шукайце жанчыну" 2-я серыя 3 10 Мультфільм 3 25 Творчы вечар І.Крутога

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 ВЕсткі 7.25 Мульці-пульці 7.45 Студыя "Рост" 8.15 Пілігрым 9.00 Парламенцкі тыдзень 9.45 "Музыка ўсіх часоў" 10.15 "Як жыць будзем?" 11.00 "Тоні", маст.ф. Францыя 12.40 Сялянскае пытанне 13.20 Дэ факта 13.35 "Эдэра" 14.30, 17.00 Тэлеэрудыт 14.35 Астралогія кахання 15.05 "Расія маладая" 12 серыя 16.05 Футбол без межаў 16.50 Відэапаэзія 17.05 "Чорны прыгажун" Мульт. ЗША 18.00 Свята кожны дзень 18.10 Сем нот у цішы 19.25 "Небяспечныя гастролі" Маст. ф. 21.05 Зусім сакрэтна 22.20 Рака часу 22.25 Аўтаміг 22.30 Спартыўная карусель 22.35 Праграма "А" 23.35 "Тайна віллы" Маст. ф. 1.15 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

8 55 Рэлігійная праграма 9 30 "Калі мы глядзім так высока..." Фільм аб М.В.Ламаносаве 10 40 "Тут цябе не сустрэне рай" Фільм - дзецям 11 50 Музыка на заказ. Скульптар М.Анікушын 12 30 Чароўная лінія 12 45,15 15 Мультфільм 13 00 Хуткая дапамога 13 30 "Казка аб зямлі Сібірскай" Фільм 15 15 Мультфільм 15 25 Казка за казкай."Пра тое, як царэвіч Елісей за чароўнымі ягадамі хадзіў" Частка 1-я 15 55 Аб'ектыў 17 10 Студыя "Уяві" 17 20 Цыркавая праграма 17 40,21 15 "Уік-энд з дэтэктывам" 18 10 Экспрэс-кіно 18 30 Інфарм-ТБ 18 55 Выбары-94. Ад першай асобы 19 10 Вялікі фестываль 19 25 "Страсці" 18-я серыя 21 05 "К.Брулоў "Гібель Пампеі" 21 50 Ваш стыль 21 55 "Аранж-ТБ" прадстаўляе тэлеканал "Не хочаш - не глядзі" 23 05 Хакей. Кубак МХЛ

НЯДЗЕЛЯ 20.11

Беларускае тэлебачанне

8.00 Добрыя весткі 8.10 Аэробіка для ўсіх. Урокі Н.Наважылавай 8.40 Слова да чалавека 9.10 Справы вайсковыя 9.55 Беларускі тур 10.15 "Ад панядзелка да панядзелка" 10.55 Дыскатэка "Тэлебома" 11.35 "АВС-клуб". Англійскую мову вучым самі 11.50 Мы такія розныя 12.35 Дайнова-інвест: "MTV. Лепшыя хіты" 13.05 Тэлевізійны "Арт-клуб" прадстаўляе. Адкрыццё сезона ў Рускім акадэмічным тэатры 13.45 Варажба на гушчы з кавай 14.25 Дзелавы веснік 14.40 Вяскоўцы. Сёньня — наша сьвята 15.40 Запрашаем на вячоркі. Абрады і звычаі перадвясельнага вечара. Баліцкі фальклорны гурт Шчучынскага раёна 16.45 Праспект. Інфармацыйна-аналітычная праграма 17.15 Тэлекрама 17.25 "Чарапашкі ніндзя" Мультсерыял 17.50 Анталогія гумару. Усё для ўсьмешкі 18.20 Любімыя камедыі "Радня". Маст. фільм 20.00 Панарама 20.40 Пяць хвілін на жарты 20.50 Калыханка 21.10 Трэці тайм. Футбольны агляд 21.55 Кубак "Стандарт-94". Рэспубліканскія спаборніцтвы па эстафетнаму арыентаваньню 22.10 "Кінатэатр "Парадыза"" маст. фільм вытв. Італія-Францыя 00.20 Камп'ютэрны палігон

Канал "Астанкіна"

7 15 Алімпійская раніца 7 50 Спортлато 8 00 Марафон-15 8 30 З раніцы і пазней 9 00 Палігон 9 30 Пакуль усе дома 10 00 Ранішняя зорка 10 55 "Пад знакам "Пі" 11 40 Дапамажы сабе сам 12 10 Эканоміка і рэформы. "Чакайце адказа" 12 40 Шпаргалка з падарункам 13 00 "Падводная адысея каманды Кусто" 13 50,17 10,22 50,23 50 Навіны 14 00 "Стратэгія перамогі" Фільм 8-й 14 55 Клуб падарожнікаў 15 45 "Нам - 75!" Юбілейны канцэрт 16 40 Японія з Калошыным 17 20 Тэлелоцыя 17 35 "Баскетбольная ліхаманка","Сапраўдныя паляўнічыя за прывідамі" Мультсерыялы (ЗША) 18 30 Уся Расія."Горад Табольск" 19 00 Надвор'е 19 10 А.Дэлон і Ж.Габэн у фільме "Двое ў горадзе" 21 00 "Нядзеля" 21 50 Спартыўны ўік-энд 22 05 Вялікі тэатр. Дні і вечары 23 05 Каханне с першага погляду 23 45 Мультфільм для дарослых 0 05 "Пяць штрыхоў да партрэта" М.Звяздзінскі 0 25 "Ювелірная справа" тэлеспектакль 2 00 Мультфільм 2 10 "Еўропа плюс" Музычная праграма

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.25 "Казкі вострава Мэн" 7.55 Мульці-пульці 8.10 Наш сад 8.40 "Снеданне для чэмпіёнаў" 9.10 Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з Іспаніі 9.40 Аты-баты... 10.10 Рускае лато 10.55 Дакум. фільмы 12.40 Сялянскае пытанне 13.20 "Не высячы"... 13.35 "Эдэра" 14.50 "Лад" - галерэя 15.15 Лепшыя гульні НБА 16.10 Белая варона 17.00 Цудоўны свет Дыснея 18.00 Свята кожны дзень 18.10 "Літаратурная газета" і яе сябры паэты" 19.25 "Паліцэйскі" Маст.ф. Францыя 21.10 Каробка перадач 21.25 У Ксюшы 22.20 Рака часу 22.25 Аўтаімгненне 22.30 Спартыўная карусель 22.35 Вячэрні салон 23.35 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

8 55 Праграма - набажэнства 9 30 Казка за казкай."Пра тое, як царэвіч Елісей дачку Еўстахія Крутога ратаваў" Часть 2-я 10 05,21 15 "Паглядзім!" 10 20 "Гісторыя кахання" 11 00 Нядзельны лабірынт 12 30 "Макар -следапыт" 3-я серыя 13 35 Этнасы Зямлі 14 05 Тэлеклуб "класіка" 15 25 Чэмпіянат Італіі па футболу 17 20 Саветы садаводам 17 30 Мультфільмы з серыі КААП 17 50 Залаты ключ 18 05 Зебра 18 50 "Фіеста", эстрадная праграма 19 30 Інфарм-ТБ 19 55 Наша кіно. "Пацярпелы" 21 35 Ваш стыль 21 40 Дом кіно 22 40 "Дарагі мой вярхоўны ўладар" Фільм аб А.В.Калчаке 23 30 "Адам і Ева +"



У Гарадзенскім раёне ёсьць неперспектыўная вёсачка Осьнікі, у якой засталося ўсяго 7 хат, дзе жывуць людзі пенсійнага ўзросту. Але гэта вёска, дзякуючы таксідэрмісту-самавучцы Рыгору Мікалаевічу Бырдзе, якому ўжо за 80 гадоў, стала вядома далёка за межамі раёна. Хата Рыгора Мікалаевіча зьяўляецца як бы заалагічным музеем. Тут можна ўбачыць на сьценах і на падлозе чучалы розных відаў птушак і зьвяроў. Напрыклад, зайца-беляка, вавёрку, куніцу, сініцу, каршуна, бугая вялікага, бусла. Бярэ Рыгор Мікалаевіч птушак і зьвяроў для чучалаў ад мясцовых жыхароў і работнікаў лясной аховы. Карыстаецца ён і паслугамі паляўнічых.

Чучалы Рыгора Мікалаевіча экспануюцца ў многіх музеях не толькі нашай рэспублікі, але і блізкага замежжа, у сярэдніх школах, навучальных установах. Робіць Рыгор Мікалаевіч чучалы вельмі ўмела, і яны выглядаюць, як жывыя.



НА ЗДЫМКУ: Р.М.БЫРДЗА з чучалам фазана.

Фатаграфаваў І.БАРЫСАЎ.

ЁСЬЦЬ ТАКАЯ КАМАНДА!

Хоць першы круг чэмпіянату Беларусі па футболу і не закончыўся, бо засталося правесьці прапушчаную гульню "Дынама" (Мн) - "Ведрыч", некаторыя вынікі прамежкавага фінішу ўсё ж можна падвесьці.

Галоўная і прыемная нечаканасьць 4-га чэмпіянату - сталае лідэрства Віцебскага КІМа. Менавіта ён і трыо менскіх клубаў разыграюць на фінішы медалі.

Так, вельмі ўрадліва правяло апошнія гульні "Дынама-93", якое з лікам 5:1 "абула" лідзкі "Абутнік", а "Тарпеда" хоць і падзяліла дома ачкі з "Шахцёрам" (2:2), усё ж утрымалася на чацьвёртым месцы. Столькі ж ачкоў пасьля перамогі (1:0) над "Дынама" (Бр) мае і гарадзенскі "Нёман", які ўступае менчукам толькі па колькасьці перамог.

На пяты гарадзенцам наступае ФК "Маладзечна", гульня якога з прыходам Л.Румбуціса прыкметна ўзмацнілася. Доказ таму - і апошняя перамога (4:0) над "Лакаматывам".

А вось "Фандок", на жаль, паўтарае "Кубкавы шлях" "Нёмана" узору 93-га года. Дзеяняты радок фіналіста Кубка Беларусі - вельмі негатыўны сюрпрыз 4-га чэмпіянату.

Унізе, акрамя "Лакаматыва", які ў апошніх турах зрабіўся добрым палігонам для бамбардзіраў і з 7-ю ачкамі стаў аднаасобным аўтсайдэрам, усе астатнія каманды - з іх "Тарпеда" (Мг), "Абутнік", "Гомсельмаш", "Шахцёр", "Шыньнік" і "Ведрыч" - зьяўляюцца будучай вясной кандыдатамі "на вылет".

А на дэсерт футбольнай вячэры 94-га года - гульня ў сераду: Беларусь-Нарвегія.

І.ПРЫВАРОЦКІ.

НАМ ПАСУЮЦЬ СОЛЬНЫЯ КАМПАЗІЦЫІ

У Хельсенкі завяршыўся чэмпіянат Эўропы па кікбоксінгу. У турніры ўзялі ўдзел больш як 450 спарцменаў.

На жаль, нашым хлопцам не пашчасьціла ў Фінляндыі. Толькі адзін з мужчынскай зборнай А.Коўцік прабіўся да паўфіналу, дзе прайграў будучаму чэмпіёну Вячаславу Цімафееву з Украіны. У выніку і наш кікбаксёр атрымаў бронзавы медаль.

Куды пасьпяховей за моцную палавіну выступіла зборная беларускіх дзяўчат. Асабліва вызначыліся беларускі ў сольных практыкаваньнях. Першы залаты медаль у гэтак званым мяккім стылі здабыла для нашай краіны студэнтка БДУ Натальля Бардзіян. Тацьцяне Анжэнка не было роўных у практыкаваньнях у жорсткім стылі. Дар'я Машара дабілася серабра ў практыкаваньнях з сапраўднай баявой зброяй самураяў - мячом.

ДОМА І СЬЦЕНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ

Удала дэбютавалі ў розыгрышы Кубка Эўрапейскай Канфедэрацыі валейболу гульцы мужчынскага клубу "Камунальнік" з Горадні.

На сваёй пляцоўцы гарадзенцы прымалі аўстрыйскі клуб "Трансфер" і перамаглі з лікам 3:0. Лік партый - 15:6, 15:3, 15:5 - яскрава сьведчыць аб суадносінах сілаў на пляцоўцы.

Гульня ў адказ адбудзецца 11 лістапада ў Аўстрыі.

Г.Н.

ДА НАС ЕДУЦЬ КСЯНДЗЫ

Дзесяць ксяндзоў-місіянераў прыехалі сёлета працаваць у прыходы Гарадзенскай каталіцкай епархіі.

На жаль, кіраўніцтва каталіцкай царквы на Беларусі па-ранейшаму аддае перавагу заезжым сьвятарам наўзамен таго, каб пашыраць набор слухачоў да каталіцкай семінарыі ў Горадні.

Г.Д.

ГУЛЯЎ КІРМАШ...

Калі з дрэў адлятае апошняе лісьце, і першыя маразы скоўваюць лужыны, калі пусьцеюць палеткі і ў кадках квасіцца капуста, на Шчучыншчыну па традыцыі прыходзіць кірмаш.

Бы ў добрыя старыя часы, зьязджаюцца на цэнтральны калгасны рынак людзі з усіх куткоў раёна: свой тавар паказаць ды прадаць, на іншых паглядзець, прысмакаў пакаштаваць, музыкаў паслухаць, ды і проста адпачыць...

Сёлетні кірмаш мала чым адрозьніваўся ад папярэдняга: гэтаксама вясяліў народ Несьцерка і скрыпач-самавучка Станіслаў Маленьчык, іграў духавы аркестр, і ад шапіка "Беспройгрышная латарэя" адыходзілі шчасьлівых з выйгранымі пеўнямі, гулялі па-сьвяточнаму ўбраныя пары, дыміліся мангалы з шашлыкамі, пеніліся піва...

З ахвотаю раскуплялі шчучынцы прадукцыю, што вывезьлі на кірмаш мясцовыя калгасы, малыя прадпрыемствы, народныя ўмельцы. Асаблівым попытам карысталіся мяса, кілбасы, вяндліна, мёд і яйкі, гародніна, сялянскае сьметанковае масла, яблыкі. Шмат аматараў заморскай садавіны сабраў шапік, дзе гандлявалі бананамі і цытрусавымі.

Прыўзьняты настрой шчучынцаў не псавалі ні халодны вецер, ні кусьлівыя цэны, бо было так шмат прыемных сяброўскіх сустрэч і ўсьмешак! Бо было сьвята, і людзі забываліся пра свае непрыемнасьці і праблемы.

А.БІБІКАВА.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

У першы тыдзень лістапада было зарэгістравана 197 злачынстваў і здарэньняў, што крыху менш, чым за папярэднія. У іх ліку - забойства, 35 цялесных пашкоджаньняў, 11 рабаваньняў, разбой, адгон, 47 крадзяжоў дзяржаўнай і 63 - асабістай маёмасьці грамадзян.

За гэты ж час у Гарадзенскай вобласьці зарэгістравана 18 дарожна-транспартных здарэньняў.

ЗАБОЙСТВА

У нядзелю ў двары дома па вуліцы Сонечнай, што ў Лідзе, быў знойдзены труп Л., якая жыла па гэтаму адрасу. З 1 лістапада яна знаходзілася ў вышуку, як без вестак прапаўшая. Высьветлілася, што забойства зьдзейсьніў яе нідзе не працуючы брат. Узбуджана крымінальная справа.

ЦЯЛЕСНЫЯ ПАШКОДЖАНЬНІ

У гэты ж дзень падчас узьнікшай сваркі музычны кіраўнік аднаго з гарадзенскіх дзіцячых садкоў ударыла нажом у грудзі мужа, які знаходзіўся ў нецьвярозым стане. Пацярпелы шпіталізаваны.

РАЗБОЙ

Не пашчасьціла пенсіянеру з Маладэчна Я. У яго выхадны дзень двое невядомых на дарозе ў лясным масіве ля вёскі Вайнеевічы Смаргонскага раёна адабралі 32000 рублёў і зімовыя боты, і ў дадатак - пабілі.

ЗАМАХ НА ЗГВАЛТАВАНЬНЕ

Так і не навучыўся паважаць законы раней асуджаны, нідзе не працуючы жыхар Горадні, які з выкарыстаньнем сілы завёў у сваю кватэру і спрабаваў згвалтаваць вучаніцу 8 класа адной з гарадзенскіх школ. Узбуджана крымінальная справа.

КРАДЗЯЖЫ

З набліжэньнем зімы ў абласным цэнтры ў "моду" ўваходзяць крадзяжы прадуктаў харчаваньня. Вось толькі некалькі прыкладаў.

Ноччу з суботы на нядзелю з падвала дома па вуліцы Гогаля зьдзейсьнены крадзеж згушчанага малака і марынаваных прадуктаў.

Прыкладна ў гэты ж час з падвала дома па вуліцы Суворава было скрадзена 24 слоікі варэньня і марынаваных прадуктаў.

Таксама слоікі з варэньнем, саланінай, гароднінай і садавінай скралі злодзеі ў многіх дамах з прыватнага занёманскага сектару Горадні. Асабліва пашчыравалі крадзежнікі на вуліцы Заня, дзе, пры адсутнасьці кансерваваньняў, забіралі нават бульбу, чырвоныя буракі, моркву.

Як і на мінулым тыдні, амаль штодзённа рэгістраваліся крадзяжы медзі.

Ноччу з панядзелка на аўторак са зварачнага цэха камбіната проціпажарных работ, што ў Горадні, скрадзена 90 метраў кабеля ад зварачнага апарата. Тэрыторыя прадпрыемства ахоўваецца вартаўніком. А на наступны дзень з будаўнічага аб'екту, які належыць будаўнічаму ўпраўленьню N 151, зьдзейсьнены крадзеж 45 метраў кабеля. Аб'ект таксама ахоўваецца вартаўніком. З тэрыторыі лідзкага завода "Ізатрон" у невызначаны перыяд зьнікла 600 метраў сілавога кабеля.

* * *

Па-ранейшаму актуальным застаецца пытаньне захоўваемасьці матэрыяльных каштоўнасьцяў у вясковых крамах.

Ноччу з суботы на нядзелю з неахоўваемай крамы "Хлеб" у вёсцы Жыровічы Слонімскага раёна зьдзейсьнены крадзеж цукру, піражнага і двух скрыняў макаронаў. З крамы ў вёсцы Цяцейкі Дзятлаўскага раёна скрадзена гарэлка, цыгарэты і прамтавары на суму 310335 рублёў. Ахоўна-пажарная сігналізацыя была ў няспраўным стане.

РАБАВАНЬНІ

Усё часьцей аб'ектам замаху з боку злачынцаў становяцца жаночыя сумачкі.

У суботу невядомы на вуліцы Дзяржынскага ў Горадні вырваў у жыхаркі горада сумачку з 1,2 мільёна злотых, 5000 рублёў і дакументамі і ўцёк.

* * *

2 лістапада каля 20 гадзін на вуліцы Лелевеля злачынца такім жа чынам абрабаваў жыхарку Горадні. У выніку разжыўся 40000 рублёў, парасонам і 2-ма ашчаднымі кніжкамі.

НАРКАТЫЧНЫЯ СРОДКІ

Падобна на тое, што Ліда ператвараецца ў "наркатычны цэнтр" вобласьці.

У першы дзень лістапада ў кватэры жыхара горада было знойдзена 700 грамаў здробленай макавай саломкі і 200 грамаў макавай вышкі, а ў другога лідчука - 200 грамаў макавай саломкі.

На наступны дзень у кватэры нідзе не працуючага жыхара Ліды знойдзена 1,8 кілаграма здробленых макавых галовак.

ФАЛЬШЫЎКА

Нідзе не працуючая жыхарка Лідзкага раёна спрабавала абмяняць у абменным пункце "Белаграпрамбанка" райцэнтра фальшывую купюру вартасьцю 5 долараў ЗША. Яна растлумачыла, што ў трэўні набыла яе ў невядомага.

ЗЛАЧЫНСТВА ТЫДНЯ

Ноччу з чацьвярга на пятніцу з даха фермы калгаса "Праўда" Смаргонскага раёна зьдзейсьнены крадзеж 20 лістоў шыфера на суму 67 тысяч рублёў. Асобы злодзеяў устаноўлены.

ПАГАРЭЎ НА "ЗЯЛЁНЫХ"

Відаць, не думаў пра магчымыя наступствы прапаршчык Г. з Ленінскага раённага ваенкамата Горадні, калі за пратэкцыю служыць у абласным цэнтры запрасіў з прызыўніка хабар у 30 долараў.

Незадачлівы ваяка злоўлены на гарачым. Узбуджана крымінальная справа.

(Ул.інф.)

ЧАРАЎНІЦА

...Надзея Іванаўна дастае свой сьвяточны строй, узнагароды за руплівую працу, розныя фотаздымкі. На добрую зайздрасьць багатае на падзеі жыцьцё гэтай простай вясковай жанчыны.

У 1987 годзе ў Маскве праходзіў агляд-конкурс народнай творчасьці рэспублік Беларусі і Таджыкістана. Семнаццаць песень у выкананьні Надзеі Бурак было запісана на кружэлку ЮНЕСКА. Вясельныя, сірочыя, сьвяточныя беларускія народныя песьні гучалі ў выкананьні нашай зямлячкі са сцэны Дома літаратара ў Маскве.

Надзея Бурак з вёскі Ахонава Дзятлаўскага раёна - цікавы, неспакойны душы чалавек. Да ўсяго ёй ёсьць справа, кожнаму дапамагчы, кожнага падтрымаць імкнецца гэтая ветлівая, з прыгожымі чорнымі, як вішні, вачыма, з прыемнай усьмешкай жанчына.

- Такая я ўжо з маладосьці, - сьмяецца Надзея Іванаўна, - ніколі не магла ўседзець на месцы. І лёс мяне не абдзяліў: было гора, нястачы, але і шмат было добрага, з многімі цікавымі людзьмі сустракалася, дзялілася сваім багацьцем - народнай песьняй.

Нарадзілася Надзея Іванаўна ў Ахонава. У сям'і Івана Жэгалы, у якога было трое дзяцей. Чалавек, які вельмі любіў зямлю, працу на ёй, імкнуўся, каб дзеці мелі хоць якую зачэпку, стаўшы дарослымі. Марыў пакінуць кожнаму хоць невялікі надзел зямлі. Іншага лёсу для іх не ўяўляў. Пра пасаг для дзяўчат трэба было думаць з маленства, інакш сядзець ім векавухамі, нягледзячы на тое, што ўдаліся спрытнымі, працавітымі і галасістымі на ўсю вёску. Асабліва Надзейка, якую любіў і шкадаваў больш за іншых. Сям'я берагла кожны рубель, кожны кавалак хлеба. Дзеці хадзілі ў польскую школу, вучыліся грамаце. Спадзяваўся стары, што, можа, каго з нашчадкаў чакае лепшы лёс, верыў, што час зьменіцца. Пры Польшчы Іван Сямёнавіч меў тры з палавай гектары добрай, воркай зямлі. За яе, зямельку-карміцельку, давялося расплаціцца ў 1939 годзе перад новымі ўладамі жыцьцём. Адразу пасьля вызваленьня бацьку забралі як кулака і вывезьлі на работы ў Комі АССР.

Перад вайной бацька ў лістах скупа паведамляў пра сябе, прасіў не высылаць пасылак з харчамі, бо сёе роўна не атрымлівае: забірае ахова. А для сям'і кавалачак сала ці сухі сыр быў добрай падтрымкай, асабліва зімою.

Пра ўсё самае жахлівае, што выпала на долю Івана Сямёнавіча, сям'я даведалася ад суседа. Ён таксама быў у тым лагеры, але выжыў і ў пяцідзесятыя гады вярнуўся дадому. Голад, бруд, цяжкая праца на лесапавале забралі тысячы і тысячы "ворагаў народа".

Сьлед бацькі згубіўся. Пасьля вайны маці шмат пісала, прасіла што-небудзь паведаміць пра мужа. І не дачакалася адказу, хоць да канца сваіх дзён не губляла надзеі, спадзявалася, што муж вернецца.

- Да вайны ўся наша сям'я жыла пад страхам, - успамінае Надзея Іванаўна. - Мы, дзеці, усёй душой адчувалі, што з намі можа здарыцца нешта страшнае, непапраўнае. У хату да маці не раз заходзілі прадстаўнікі ўлады і сурова паведамлялі, каб сям'я рыхтавалася да высылкі. Толькі ў канцы саракавых зразумелі, што ўсё трывожна-страшнае мінула, і нас больш не будуць турбаваць.

Потым вучылася ў школе. Некаторы час працавала піянерважатай. Спецыяльнай адукацыі, вядома, не мела, і на яе месца прыслалі дзяўчыну пасьля тэхнікума. Сама пайшла ў калгас ільнаводам. Неўзабаве прызначылі зьвеньнявой.

Адразу пасьля вайны стварылі жанчыны калгасны хор народнай песьні. Спачатку, праўда, прымушалі хадзіць, а потым дзяўчаты прывыклі, ішлі ахвотна, з настроем. Часу ў Надзеі Іванаўны было няшмат. Трое малых дзяцей патрабавалі ўвагі. Ды і пакінуць іх не было на каго. Хор звычайна зьбіраўся ў школе, і даводзілася браць малых з сабою, садзіць за парту, займаць, каб не перашкаджалі.

Сьпяваць Надзея Іванаўна любіла шчыра, ад усёй душы. Навучылася многім песьням ад бацькі, добрага знаўцы абрадаў. Надзею заўважылі, вылучылі на сольныя партыі. Быў у яе надзвычай прыемны, моцны голас, брала ноту любой вышыні.

У 1958 годзе хор выступаў на першым рэспубліканскім фестывалі ў Горадні, заняў адно з прызавых месц. Першае выступленьне на вялікай сцэне Надзея Бурак памятае па сённяшні дзень. Яна сьпявала вольныя песьні.

Не аднойчы Надзею запрашалі ў Менск, запісвалі на плёнку забытую "Дaліну-далінушку" і "Юр'я".

У 1990 годзе Надзея Іванаўна была госьцем на сьвяце, прысьвечаным 80-годдзю Генадзя Цітовіча. Выйшаў каляндар на 1991 год, на якім сфатаграфавана група з Ахонава. У цэнтры - Надзея Бурак. Жанчыны сьпявалі "Юр'я". Аказалася, што абрадавыя песьні гэтага вясновага народнага сьвята дзятлаўскія сьпявачкі захавалі ў поўным варыянцы.

Іосіф ЗАЯЦ, журналіст.

"ПАГОНЯ"

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд "БАЦЬКАЎШЧЫНА".

Адрас рэдакцыі: 230023, г.Горадня, вул.Дамініканская, 1.

Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.

Газета выдаецца па пятніцах 4 разы на месяц.

Пры перадруку спасылка абавязкова.

Індэкс 63124. Ліцэнзія № 465.

Фотанабор, афсетны друк.

Гарадзенская абласная ўзбуйненая друкарня: 230003, г.Горадня, вул.Паліграфістаў,4.

Заказ 4323.

Наклад 4628 паасобнікаў.